Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарксму Каму ністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 214 (4119)
НЯДЗЕЛЯ, 9 жніўня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

20-ты дзень месячніка праверкі і самаправеркі

40.000 гэктараў ільну церабіць у пяціднёўку, ня менш!

ЗА 2 МІНУЛЫЯ ПЯЦІДНЁЎКІ ВЫЦЕРАБЛЕНА ТОЛЬКІ 8.218 ГЭКТ.

Неадкладна арганізаваць дапамогу калгасаў рашаючым ільнаводчым раёнам

Спыніць цякучасьць, замацаваць рабочую сілу

У рэзультаце няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі з кожным днём мацнее сацыялістычная эканоміка нашай краіны. У строй становяцца новыя гіганты індустрыі, вырастаюць новыя буйныя савецкія і калектыўныя гаспадаркі, што забясьпечвае бальшавіцкай партыі перамогу сусьветна-гістарычнага значэньня.

Сацыялістычная рэканструкцыя ўсяе народнае гаспадаркі **ПА-НОВАМУ** паставіла пытаньне аб **ПРАЦЫ**, аб **РАБОЧАЙ СІЛЕ**. Шпаркі рост прамысловасьці, разгорнутае будаўніцтва саўгасаў і калгасаў прывяло краіну пралетарскай дыктатуры **ДА ПОЎНАЙ ЛІКВІДАЦЫІ БЕС ПРАЦОЎЯ.**

У сувязі з паляпшэньнем матар'яльнага і культурна-бытавога становішча калгасных і бяднацка-серадняцкіх працасобных мас, у працоўнага насельніцтва вёскі аднаў стымул уходу ў горад, на заработкі. Самацёчны прытоп рабочай сілы на фабрыкі і заводы, амаль спыніўся. Між тым, сацыялістычная індустрыя, якая расьце і разьвіваецца надзвычайна шпарка, разгортваньне і пашырэньне лёгкай прамысловасьці будаўніцтва саўгасаў, МТС, патрабуюць **НОВЫХ МІЛЬЁНАЎ РАБОЧЫХ РУК.**

Дзе ўзяць гэтыя шматлікія кадры рабочых?

Іх павінны даць калгасы, як асноўныя пастаўшчыкі рабочай сілы для сацыялістычнай прамысловасьці. Прыток гэтых мільённых кадраў рабочых трэба **АРГАНІЗАВАЦЬ.** Трэба ўсямерна папярыць вопыт перадавых калгасаў, якія выступілі з працоўнай арганізацыі сталінскі заклік калгасьнікаў-адходнікаў у сацыялістычную прамысловасьць. Спадзяецца на самацёк у забясьпячэньні прамысловасьці рабочай сілай нельга. Тав. **Сталін** у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў па тэхнім пытаньні з вычарпальнай выразнасьцю заявіў: **«Ад «палітыкі» самацёку трэба перайсьці да палітыкі арганізаванага набору рабочых для прамысловасьці».**

Аднак, вярбоўка рабочай сілы яшчэ не вырашае поўнасьцю пытаньне забясьпячэньня кадрамі рабочых нашай прамысловасьці. Вярбоўка — толькі палова выкананьня гэтай вялізарнай задачы. **Вярбоўка ня можа вычарпаць пытаньня забясьпячэньня прамысловасьці рабочай сілай без спалучэньня яе з рашучым змаганьнем за ЗАМАЦАВАНЬНЕ РАБОЧЫХ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, за ПАСТАЯННЫЯ кадры рабочых, са змаганьнем ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ЦЯКУЧАСЬЦІ рабочай сілы.**

Цякучасьць рабочае сілы — гэта нецярпімае зло на нашых прадпрыемствах. «Цярпець» зараз цякучасьць рабочай сілы — значыць разлажыць нашу прамысловасьць, знішчыць магчымасьць выкананьня вытворчых пляноў, падарваць магчымасьць паляпшэньня якасьці прадукцыі». (Сталін).

Гэта палажэньне, высунутае прагадыром партыі, цалкам пацьвярджаецца канкрэтнымі прыкладамі нашай рэчаіснасьці. Ускрыцьцё карэньняў зрываў вытворчых праграм паказвае, што адзін з асноўных прычын зьяўляецца іменна цякучасьць рабочай сілы.

Так, на **Бабруйскім дрэва-апрацоўчым камбінаце**, дзе панавала хранічнае невыкананьне вытворчай праграмы, за 1-е паўгодзьдзе бягучага году **пакінула прад прыемства 1990 чал.**, а прыбыло 2.530 чал. Асабліва пагражаючых разьмераў дасягнула цякучасьць на лесазаводах № 6 і 7.

Аналёгічнае становішча цякучасьці рабочай сілы мы маем і на іншых прадпрыемствах БССР. На фабрыцы **«Вэзувій»** (Гомель) у асобныя месцы першага паўгодзьдзя пакідала работу па 100-150 чалавек. Надзвычайна вялікі процант цякучасьці і **на Гомсельмашы** (больш 7 проц. у адносінах да агульнага ліку рабочых). Ня лепш справа стаіць і па радзе віцебскіх прадпрыемстваў **(«Дзьвіна», «Сьцяг індустрыялізацыі», акулярная фабрыка)**. Выбарачнае абсьледваньне **60 прадпрыемстваў** БССР дае наступны малюнак. У першым квартале бягучага году на 60 прадпрыемстваў **прынята 2.946 чалавек** рабочых або 16,2 проц. агульнай колькасьці зачатых на гэтых фабрыках і заводах. **Пакінула-ж прадпрыемствы за гэты пэрыяд 2.650 чалавек** або 14,6 проц. У ліку тых рабочых, якія пакінулі прадпрыемства 70,5 проц. падае на **пастаянны** склад. Такім чынам, на 60 прадпрыемствах **адбылося нязвычайнае абнаўленьне рабочых,** што бязумоўна мела самы адмоўны ўплыў за вытворчыя працэсы, ударыла па выкананьні прамфінпляну, бо нова-прыбыўшыя рабочыя не маглі адразу асьвоіць працэсы вытворчасьці, не маглі даць добраякасную прадукцыю.

У чым прычыны такой нязвычайнай цякучасьці рабочай сілы? Яны заложаны перш за ўсё ў **«ЛЕВАЦКАЙ» ЎРАЎНІЛАЎЦЫ ЗАРПЛАТЫ, у адсутнасьці перасоўваньня рабочых НА БОЛЬШ КВАЛІФІКАВАНУЮ ПРАЦУ, у тым, што партарганізацыі раду прадпрыемстваў нядбайна адносіліся да культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, ня здолелі замацаваць кадраў рабочых за прадпрыемствам.**

Гэта пацьвярджаецца канкрэтнымі прыкладамі. На **Дрэваапрацоўчым** камбінаце, на **Гомсельмашы**, на **акулярнай** фабрыцы і інш. прадпрыемствах рабочыя пакінулі працу іменна з прычыны таго, што былі пастаўлены ва ўмовы дрэннага культурна-бытавога абслугоўваньня, іменна ў сувязі з ураўнілаўкай, якая панавала на прадпрыемствах.

І сапраўды. Хіба-ж дапусьціма, каб кваліфікаваны сталяр стандартнага цэху на камбінаце адтрымліваў **МЕНШ** (140-150 рубл. ў месяц) **за чорнарабочага** гэтага-ж цэху, які аплачваецца ў 200-250 рубл. штомесячна.

Фабрычна-заводзкія арганізацыі не займаліся пытаньнем павышэньня кваліфікацыі рабочых, ня думалі аб іх культурна-бытавым абслугоўваньні. З 7 цэхавых парт'ячэек **Бабруйскага камбінату**, ніводная не займалася пытаньнямі рэгуляваньня зарплаты, павышэньня кваліфікацыі рабочых, пытаньнямі іх забясьпячэньня. **Ня толькі ячэйкі, але не займаўся і партыйны камітэт.** Характэрна, што данае становішча адносіцца ня толькі да партарганізацыі камбінату, але і **да ўсіх** астатніх прадпрыемстваў, на якіх наглядалася цякучасьць рабочай сілы.

Ліквідаваць цякучасьць, замацаваць рабочых на вытворчасьці—галавая задача кожнай вытворчай парт'ячэйкі, кожнага парткалектыву, бо **«без пастаяннага складу рабочых, якія больш менш усвоілі тэхніку вытворчасьці і прывыклі да новых маханізмаў, немагчыма выканаць вытворчыя пляны».** Практычнае вырашэньне гэтай задачы патрабуе ад кожнай парт'ячэйкі **ажыцьцяўленьня** раду **КАНКРЭТНЫХ** мерапрыемстваў. Тыя клапаты, праз якія цячэ рабочая сіла з прадпрыемстваў, павінны быць раз і на заўсёды закрыты. Ліквідацыяй «лявацкай» ураўнілаўкі будзе ўнікнута адна з прычын, якая выклікае цякучасьць. **Адсюль у парадак дня вытворчых партарганізацый павінна быць неадкладна пастаўлена пытаньне аб УПАРАДКАВАНЬНІ ЗАРПЛАТЫ** рабочых, **у першую чаргу ВЯДУЧЫХ ПРАФЭСІЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ.** Цэхавыя і зьменныя парт'ячэйкі кожная ў сваіх канкрэтных умовах, павінна глыбока прапрацаваць гэтае пытаньне, выявіць канкрэтныя факты ўраўнілаўкі, з тым, каб парткалектыў у маштабе ўсяго прадпрыемства мог дабіцца яе поўнай ліквідацыі.

Другое—паляпшэньне матар'яльнага дабрабыту і культурнага абслугоўваньня рабочых мас. Зараз, калі набыты вялікія посьпехі ў разьвіцьці сацыялістычнай эканомікі, для гэтага ёсьць усе магчымасьці. Патрэбна толькі бальшавіцкая работа партыйных арганізацый, з тым, каб гэтыя магчымасьці скарыстаць для паляпшэньня забясьпячэньня рабочых у першую чаргу асноўных галін вытворчасьці. Цэхавыя парт'ячэйкі і партарганізацыі практычнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы могуць дабіцца толькі пры той умове, калі ў цэнтр увагі сваёй дзейнасьці паставяць штодзённыя клопаты аб культурна-матар'яльным абслугоўваньні рабочых. Работа бытавых устаноў павінна быць узята пад строгі кантроль партыйных ячэек і пралетарскай грамадзкасьці. **АБ РАЗЬМЕРКАВАЛЬНІКАХ, АБ СТАЛОЎЦЫ, ДЗІЦЯЧЫХ ЯСЬЛЯХ, АБ КВАТЭРЫ І ІНШ. БЫТАВЫХ ПЫТАНЬНЯХ ПАВІННЫ ЗАГАВАРЫЦЬ НА СВАІХ СХОДАХ ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ, ДАБІВАЮЧЫСЯ ПАЛЯПШЭНЬНЯ РАБОТЫ ГЭТЫХ УСТАНОЎ.** Партыйныя арганізацыі цалкам і ў першую чаргу адказваюць за вырашэньне гэтых пытаньняў.

Прыходзіцца канстатаваць, што на сёньняшні дзень на прадпрыемствах БССР сапраўдная барацьба з цякучасьцю рабочай сілы, работа па арганізацыі кадраў як сьлед яшчэ не разгарнулася. Такому становішчу трэба неадкладна пакласьці канец, рашуча ўзяцца за перабудову работы на аснове паказаньняў тав. Сталіна.

Арганізуючы прыток рабочай сілы з калгасаў, замацоўваючы яе на прадпрыемствах, арганізацыі КП(б)Б даб'юцца новых посьпехаў у разьвіцьці сацыялістычнай прамысловасьці БССР.

За 6-пяціднёвак скончыць церабленьне ільну

Уборка ільну па БССР разьлічана на 6 пяціднёвак, гэта значыць, што ў кожную пяціднёўку павінна быць убрана ня менш 40.000 гэкт. ільну, каб своечасова яго выцерабіць. Паводле апошняй зводкі НКЗБ на 5-га жніўня ільну ўбрана 8.218 гэкт. або 3,4% пляну. У параўнаньні з мінулым апошняя зводка дала прырост ТОЛЬКІ НА 2,4%. Тэмп церабленьня ільну выклікае сур'ёзную небясьпеку і патрабуе НЕАДКЛАДНЫХ МЕР, як з боку цэнтральных, так і раённых арганізацый.

Асноўнай прычынай слабога разгортваньня церабленьня ільну, як мы і раней адзначалі, зьяўляецца СЛАБЫ ХОД УБОРКІ СЕНАЖАЦІ, АЗІМЫХ І ЯРАВЫХ—несваячасовую ўборку якіх выклікалі апартуністычныя адносіны да ўвядзеньня ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, УЛІКУ ПРАЦЫ І РАССТАНОЎКІ СІЛ, у цэлым радзе раёнаў. Ня ў меншай ступені ўборку збожжавых затармазіла бязьдзейнасьць, «чаканьне» завозу машын. На жаль, гэта апартуністычнае спадзяваньне мае месца і зараз у адносінах да ўборкі ільну. Замест прыняцьця рашучых мер мабілізацыі моладзі, усіх працаздольных калгасьнікаў і калгасьніц апартуністы спадзяюцца на самацёк і не арганізуюць узаемнай дапамогі паміж калгасамі.

У выніку мы маем выкананьне пляну ўборкі сенажаці на 77,3%, азімых на 76,3%, яравых — 9,3% і ільну — на 3,4%. Паўднёвыя раёны заданьня па ўборцы ільну ня выконваюць. Так, на 5-га жніўня паўднёвыя раёны выцерабілі ільну толькі 11,6% пляну, тады як выкананьне павінна было быць ня менш 16,6% у кожную пяціднёўку. Цэнтральныя раёны — 2,5%, а паўночныя РАШАЮЧЫЯ ІЛЬНАВОДЧЫЯ РАЁНЫ свой плян выканалі толькі на 0,5%.

Задача раённых арганізацый дабіцца рашучага ПЕРАЛОМУ ва ўборцы сенажацяй і збожжавых і ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ усе сілы і сродкі на церабленьне ільну. Наладзіць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва, арганізаваць дапамогу слабым калгасам, якія адчуваюць недахоп рабочай сілы. Вызначыць цьвёрдыя тэрміны церабленьня ільну і даць канкрэтныя заданьні кожнаму калгасу і брыгадзе церабільшчыкаў.

Раённыя штабы і самаправерачныя камісіі па правядзеньні генэральнай праверкі павінны дабіцца арганізацыі сустрачных пляноў і норм выпрацоўкі ў кожным калгасе. На аснове зьдзельшчыны і правільнага ўліку працы кожнага калгасьніка арганізаваць шырокую хвалю сацспаборніцтва і змагацца за максымальнае скарачэньне тэрміну ўборкі ільну.

Даць рашучы адпор кулаку і яго агентам — апартуністам, якія жадаюць зрывам зьдзельшчыны і вучоту затармазіць вырашэньне праблемы тэхкультур.

Калгас «Бальшавік». Тав. Арлоў, калгасьнік-ударнік, прэміяваны за перавыкананьне норм выпрацоўкі.

Зводка аб ходзе ўборкі натуральных сенажацяй, азімых і яравых і ільну па раёнах БССР па становішчы на 5 VIII 1931 году (без саўгасаў)

Назва раёнаў	Уборка натурсена ў га	Уборка азімых (жыт. пшаніцы) у га	Уборка яравых збожжавых у га	Уборка ільну ў га
ПАЎДНЁВЫЯ:				
Брагінскі	91,2	100	50,6	26,8
Буда-Кашал.	89,0	98,4	18,8	50,6
Бабруйскі	81,7	90,2	9,0	—
Веткаўскі	64,4	100,0	5,4	10,8
Гітускі	100	91,7	14,1	10,8
Гомельскі	91,4	88,2	54,4	17,1
Жыткавіцкі	83,8	78,8	2,4	—
Жлобінскі	64,4	93,8	20,9	5,9
Кармянскі	28,9	16,8	6,8	—
Камарынскі	94,6	100	13,3	8,7
Каралінскі	94,9	100	—	30,9
Лоеўскі	92,0	100	—	—
Любанскі	88,3	100	28,6	19,5
Лельчыцкі	73,3	83,7	10,5	—
Мазырскі	51,2	16,2	—	—
Нараўлянскі	98,4	100	23,2	42,0
Парыцкі	20,5	31,9	7,2	—
Пятрыкоўскі	87,8	100	25,9	—
Рагачоўскі	68,7	82,5	4,6	1,6
Рачыцкі	91,2	95,2	11,8	26,0
Слуцкі	70,8	62,1	6,7	5,3
Старобінскі	93,5	97,6	5,9	25,9
Ст.-Дарожскі	100	97,1	15,5	0,6
Тураўскі	75,5	80,2	14,5	8,6
Церахаўскі	97,3	100	22,8	30,5
Чачэрскі	93,5	99,2	5,4	11,3
Чырв.-Польскі	71,0	100	23,4	0,1
Чырв.-Слаб.	80,5	60,4	—	—
Уваравіцкі	29,0	59,6	2,3	1,0
Хойніцкі	77,2	100	20,5	30,5
Разам па паўднёвых зонах	77,3	83,6	13,6	11,6
ЦЭНТРАЛЬНЫЯ:				
Асіпавіцкі	100	97,2	5,6	3,6
Быхаўскі	69,2	78,2	9,2	—
Барысаўскі	98,4	96,2	4,1	—
Бялыніцкі	100	72,2	9,6	—
Вягомльскі	100	48,1	4,5	—
Бярэзінскі	100	91,9	6,5	0,1
Горацкі	81,1	62,2	5,6	2,4
Заслаўскі	77,6	50,2	4,6	—
Клімавіцкі	78,6	100	23,0	—
Крупскі	83,6	100	—	—
Капыльскі	85,0	5,4	—	—
Касьцюковіцкі	67,6	93,1	26,0	—
Клічаўскі	45,1	54,4	4,5	—
Койданаўскі	100	67,8	8,4	—
Крычаўскі	93,2	96,4	19,6	0,5
Лагойскі	56,2	16,4	1,4	—
Магілеўскі	93,0	58,9	6,5	—
Мсьціслаўскі	100	57,5	4,6	—
Менскі	93,2	97,0	0,9	—
Прапойскі	94,5	85,6	22,5	5,5
Пухавіцкі	85,6	68,6	19,1	21,3
Пленчаніцкі	100	70,8	—	—
Смалявіцкі	66,6	69,5	14,8	43,6
Талочынскі	100	30,2	1,2	0,1
Чэрвеньскі	100	87,1	16,4	5,8
Чавускі	79,1	43,2	14,0	—
Чэрыкаўскі	100	87,8	19,6	6,2
Шклоўскі	83,2	100	11,4	7,9
Вузьдзенскі	72,7	81,6	3,3	—
Разам па цэнт. раёнах	84,0	70,8	9,9	2,5
ПАЎНОЧНЫЯ:				
Асьвейскі	64,0	68,0	2,3	—
Аршанскі	59,1	13,0	1,7	0,7
Бешенковіцкі	55,0	75,6	1,8	—
Віцебскі	78,9	36,2	3,9	—
Вушацкі	57,9	52,2	—	—
Гарадоцкі	65,1	93,5	3,9	—
Дубровенскі	53	54,3	—	—
Дрысенскі	68,5	53,3	—	—
Лёзьненскі	76,8	100	2,8	3,3
Лепельскі	63,0	100	—	—
Полацкі	78,2	100	—	—
Расонскі	60,1	92,2	0,4	0,3
Сураскі	95,6	99,1	—	0,6
Сенненскі	68,0	86,6	—	—
Сіроцінскі	100	100	—	—
Чашніцкі	54,4	87,7	—	—
Разам па паўночн. зоне:	69,7	73,9	1,2	0,5
Разам па БССР:	77,3	76,3	9,3	3,4

Увага: Зводка складзена па даных 61 раёну па становішчы на 5 жніўня, а па астатніх на папярэднія тэрміны.

Наркамзем Бел. пасеўбюро СЬМІРНОЎ.

Практыку калгасаў „Энэргія" і „Праца" —усім калгасам Ельшчыны

ЕЛЬСК. На Ельскім раёне было ўбрана 95 проц. жыта. З 24.500 гэкт. сенажаці скошана і ўбрана толькі 15.500 гэкт. Распачалася ўборка ільну, якога да 1-га жніўня ўбрана 20 проц.

Адставаньне ва ўборцы сенажаці прыпадае, галоўным чынам, на адناасобны сэктар, які выканаў ня больш 55 проц. пляну ў той час, калі калгасы далі 80 проц. Вельмі дрэнна з сіласаваньнем. Агульны **плян сіласаваньня** па раёне **выканан толькі на 1,5 проц.**

У тых калгасах раёну, дзе правільна арганізавана работа і дзе налажан улік працы дасягнуты значныя посьпехі ў разгортваньні ўборачнай. **Першымі ў раёне скончылі ўборку жыта і ячменю калгас «Энэргія» і камуна «Праца».**

Камуна засіласавала 50 тон сіласу і прыступіла да падрыхтоўкі траншэі на 100 тон сіласнай масы. Поўнасьцю падрыхтаваны машыны, абруч і іншы с.-г. інвэнтар да асеньняй сяўбы.

Калгас **«Энэргія»** закончыў уборку жыта і ячменю **да 1 жніўня і прыступіў да ўборкі ільну, канапель і аўса.** На сёньняшні дзень у калгасе ўбрана **звыш 50 проц. аўса.** Значную ролю адыграла **штодзённая палявая газэта «Ударнік уборачнай»**, якая штодзённа дапамагала калгасьнікам выяўляць прагульшчыкаў, рвачоў і гультаёў, дапамагала правільна арганізаваць работу, арганізоўвала масу на барацьбу з прарывамі. У калгасе кожны калгасьнік азнаёмлен з парадкам разьмеркаваньня даходаў.

Раённыя арганізацыі і ўстановы павінны зараз-жа перанесьці вопыт «Энэргіі» і «Працы» ў адстаючыя калгасы.

М. Няхай.

Злачынное хаваньне с.-г. машын

Чырвонапольле. Машыны ў калгасе «КІМ», Гарэзінскага сельсавету, Чырвона-Польскага раёну ўтрымліваюцца вельмі безгаспадарча.

Дзьве сявяркі цэлы год прастаялі над адкрытым небам і **прышлі ў поўную негоднасьць.** 2-хлямешныя плугі валяюцца на скоцкім двары.

Прывезеныя чатыры малатарні ня могуць быць выкарыстаны з-за недахопу саломатрасаў.

Такой злачыннай безгаспадарчасьці трэба палажыць канец.

Калгасьнік.

Дырэктыва аб перакідцы 30-тысячнікаў ігнаруецца

ГАРАДОК. (Па тэлеграфу) Абмен вопытам паміж калгасамі — перакідка 30-тысячнікаў—у Гарадоцкім раёне зрываецца. Наглядаецца апартуністычная недаацэнка гэтага мерапрыемства з боку раённых арганізацый. **Старшыні калгасаў не адпускаюць людзей для перакідкі ў іншыя калгасы.**

У раёне налічваецца 397 калгасаў. Да гэтуль перакінута толькі 12 чалавек у парадку абмену вопытам. Раён павінен урэшце выканаць дырэктыву партыі.

Мікуцкі

Аб ходзе перабудовы спажывецкай кааперацыі

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 6 жніўня 1931 г.

Заслухаўшы паведамленьне тав. Хаскіна аб ходзе перабудовы спажывецкай кааперацыі, бюро ЦК КП(б)Б канстатуе, што праца па перабудове спажывецкай кааперацыі яшчэ далёка ня скончана. Асабліва нездавальняюча праходзіць разгортваньне раздробнага гандлю па аб'яднаньнях і недапушчальна слаба разгортваецца дадатковая раздробная гандлёвая сетка.

У дадатак да пастановы бюро ЦК КП(б)Б ад 16 ліпеня 1931 г. прапанаваць правесьці наступныя мерапрыемствы:

1.

На працягу жніўня месяца пашырыць гандлёвую сетку па гарадох БССР на 267 адзінак, з іх—па Менску 70, Гомелі—45, Віцебску—45, Магілеве—25, Воршы—15, Полацку—10, Мазыры—5, Бабруйску—25, Барысаве—15 з тым, каб гандлёва-гапінныя раздробныя аб'яднаньні БКС дадаткова пашырылі сваю сетку на 105 адзінак, ЦРК і ЗРК—на 105, астатнюю колькасьць у гарадох Рэчыца, Добруш, Жлобін і інш. рабочых пунктах.

ЦК абавязвае прэзыдыум Белкаапсаюзу разгортваньне гандлёвай сеткі праводзіць па лініі максымальнага пашырэньня прадуктовай і гародніннай сеткі з большым набліжэньнем яе да фабрык, заводаў і рабочых акраін і адмовіцца ад канцэнтрацыі яе толькі ў цэнтры гораду, а стварэць гандлёвую сетку ў рабочых пунктах, надалёка ад прамысловых прадпрыемстваў.

2.

Зацьвердзіць пабудову на працягу жніўня 14 новых магазынаў па БССР. Згадзіцца з прапановай прэзыдыуму Белкаапсаюзу, што гэтыя 14 магазынаў, якія будуюцца,—павінны быць прадуктовымі і ў рабочых раёнах.

3.

Прыняць да ведама паведамленьне тав. Хаскіна, што на рамонт і будаўніцтва гандлёвай сеткі Цэнтрасаюзам пераведзена 500.000 руб. Улічваючы абсалютную недастатковасьць гэтай сумы, прасіць прэзыдыум Цэнтрасаюзу павялічыць асыгнаваньні як на рамонт, так і на пашырэньне крамной сеткі па БССР яшчэ 500.000 рублёў.

4.

Лічыць неабходным неадкладна разгарнуць працу па арганізацыі савецкіх рынкаў, асабліва ў буйных гарадзкіх цэнтрах. Для гэтай мэты абавязаць Белкаапсаюз і Наркамснаб неадкладна склясьці план разгортваньня і арганізацыі савецкіх рынкаў з тым, каб прыстасаваньне памяшканьняў, якія ёсьць — на раней існаваўшых рынках і будаўніцтва новай парковай сеткі на гэтых рынках было-б скончана на працягу жніўня і верасьня месяцаў.

5.

Ускласьці поўную адказнасьць за неадкладную перадачу гандлёвай сеткі, адвод неабходных вучасткаў для будаўніцтва новай гандлёвай сеткі, а таксама адвод вучасткаў для арганізацыі савецкіх рынкаў—на старшынь гарсаветаў і сакратароў гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі.

6.

Даручыць тав. Бэнэку пры канчатковым устанаўленьні аб'ектаў ударнага будаўніцтва забясьпечыць неабходнымі матар'ялямі пабудову 14 крам і рамонт сеткі, якая існуе і пашыраецца.

7.

Лічыць абавязковым—перавод магазынаў з месячным зваротам у 100.000 руб.—на поўны гаспадарчы разрахунак з самастойным кантакарэнтным рахункам у Дзяржбанку, даўшы права загадчыкам гэтых магазынаў самастойнай закупкі тавараў. Прэзыдыуму БКС неадкладна прыступіць да ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы.

Даручыць БКС прапрацаваць пытаньне адносна пераходу на гаспадарчы разрахунак гандлёвых прадпрыемстваў з меншым зваротам.

8.

Прызнаючы, што адным з тормазоў у разгортваньні раздробнай гандлёвай дзейнасьці рэспубліканскіх аб'яднаньняў БКС зьявілася застаўленьне за ім і гуртовай гандлёвай работы, прапанаваць Прэзыдыуму Белкаапсаюзу ў 2-дэкадны тэрмін вызваліць рэспубліканскія аб'яднаньні па раздробным гандлі ад гуртовай працы, стварыўшы з самастойныя рэспубліканскія гуртовыя гандлёвыя аб'яднаньні: гуртовае аб'яднаньне па прамтаварах, аб'яднаньне па прадтаварах і аб'яднаньне па гаспадарчых таварах. Таксама лічыць мэтазгодным падзел аб'яднаньняў Белкаапплодагародніны на 2 аб'яднаньні—аб'яднаньне па раздробным гандлі Плодагароднінай і аб'яднаньне па загатоўках і збыце.

Для паляпшэньня кіраўніцтва загатоўкамі мяса, скурсырцу, конволасу, шчаціны і г. д. прыняць прапанову прэзыдыуму Белкаапсаюзу аб стварэньні галіннага рэспубліканскага аб'яднаньня па жывсырцы.

9.

У мэтах паляпшэньня кіраўніцтва арганізацыйна-гаспадарчай працай ЗРК лічыць мэтазгодным стварэньне ўнутры БКС інструктарскай групы па кіраўніцтве ЗРК. Прэзыдыуму БКС у дэкадны тэрмін гэтую групу стварыць, устанавіўшы неабходны інструктаж і жывое кіраўніцтва ЗРК. Прапанаваць тав. Хаскіну ўнесьці канкрэтную прапанову па пытаньні далейшага пашырэньня ЗРК.

10.

З прычыны таго, што практыка кааперацыйных арганізацый у разьмеркаваньні пайкоў прывяла да таго, што спажывец ператварыўся ў дробнага гуртавіка (выдача пайка адзін раз у месяц), лічыць неабходным неадкладна скасаваць гэту практыку выдачы пайка і ўвесьці такую сыстэму продажу нармаваных прадуктаў, пры якой рабочы спажывец у любы час на працягу месяца мо-бы купляць у любой колькасьці неабходныя яму прадукты ў адпаведнасьці з устаноўленымі нормамі. Абавязаць БКС і Наркамснаб у дэкадны тэрмін распрацаваць новую сыстэму выдачы нармаваных прадуктаў з тым, каб было абавязкова гарантавана поўнае забясьпячэньне за рабочым-спажыўцом колькасьці нармаваных прадуктаў, якія яму належаць.

11.

Прызнаць, што новая сыстэма аплаты працы работнікаў прылаўка ня ўсюды праведзена. Абавязаць ЦП саюзу работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю і прэзыдыум БКС на працягу двух дэкад увесьці новую сыстэму аплаты працы па ўсёй кааперацыйнай сетцы.

12.

Адзначаючы выключнае значэньне, якое набывае зараз зьнішчэньне ўсё яшчэ існуючай чаргі ў крамах і магазынах, антысанітарнае становішча крам і магазынаў, грубых адносін да спажыўца — прапанаваць прэзыдыуму ЦСПСБ, прэзыдыуму БКС і партыйным арганізацыям дабіцца на працягу месячніка па ліквідацыі чаргі зусім канкрэтных практычных вынікаў. Для гэтай мэты неабходна значна шырэй разгарнуць масава-палітычную працу вакол гэтай задачы, а таксама правесьці некалькі паказальных судоў над кіраўнікамі арганізацый, якія дапускаюць у магазынах і крамах чаргу, антысанітарнае становішча і г. д.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на рашучае выкараненьне няўпэўнасьці абыякавых адносін да рабочага спажыўца і яго запатрабаваньняў, што зьяўляецца найбольш трывожным ва ўсёй працы спажывецкай кааперацыі.

13.

Адзначыць, што дырэктыва ЦК аб арганізацыі райзагаў у раёнах — мясцовымі і партыйнымі арганізацыямі выконваецца нездавальняюча, толькі ў некаторых раёнах прыступлена да арганізацыі райзагаў, што сьведчыць аб недаацэнцы значэньня дыфэрэнцыяцыі работы спажывецкай кааперацыі ў раёне і паляпшэньня яе загатоўчай дзейнасьці.

Абавязаць райкомы партыі безагаворачна выканаць дырэктывы ЦК аб стварэньні райзагаў і скончыць іх арганізацыю па ўсіх раёнах на працягу дэкаднага тэрміну.

14.

Лічыць, што работа па ўкамплектаваньні кадраў БКС ня скончана. Прызнаць неабходным перадачу БКС неадкладна 10 кіруючых работнікаў. Сакратарыяту ЦК на працягу 5 дзён правесьці гэту перадачу.

Бяз кіраўніцтва і дапамогі

СТАРОБІНА. У калгасе «Вольная праца», Старобінскага раёну да гэтага часу не абагулены с.-г. інвэнтар і рабочая жывёла. Азімыя пасевы таксама не абагулены. Уборка сенажацяй і азімых праходзіць самацёкам. Зьдельшчыны фактычна няма.

Усё гэта прывяло да таго, што нарады, якія даюцца калгасьнікам па ўборцы ўраджаю, сыстэматычна ня выконваюцца. У калгас прапезьлі падкулачнікі, якія праводзяць разлагаючую работу. Ні праўленьне калгасу, ні раённыя арганізацыі ня прымаюць належных мер, кабачысьціць калгас ад варожых элементаў, правільна арганізаваць у ім працу. Па апартуністычнай недаацэнцы задач гаспадарчага замацаваньня калгасаў, якую праяўляюць раённыя земельна-калгасныя органы, трэба ўдарыць са ўсёй рашучасьцю.

Нодзльсон і Цырлін

Вынікі калгаснай узаемадапамогі

КАПЫЛЬ.

28 КАЛГАСАЎ КУЧЫНСКАГА, СТ. КАПЫЛЬСКАГА І ВЯЛЕШЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ, КАПЫЛЬСКАГА РАЁНУ ПОЎНАСЬЦЮ ЎБРАЛІ СЕНАЖАЦЬ І АЗІМЫЯ. Гэтае пасьпяховае выкананьне дасягнута таму, што КАЛГАСЫ ДАПАМАГАЛІ АДЗІН АДНАМУ МАШЫНАМІ І РАБОЧАЙ СІЛАЙ.

Калгасы прыступілі да ўборкі яравых.

КЛЮЙКО.

20-ты дзень месячніка праверкі і самаправеркі

Райштабы і самаправерачныя камісіі

ПАВІННЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫВЫ НКЗ І КАЛГАСЦЭНТРУ СССР:

„Не пазьней 15 жніўня рэвізійная камісія ў кожным калгасе павінна зрабіць даклад агульнаму сходу калгасьнікаў (або сходу ўпаўнаважаных) аб выніках запісу працадзён у разрахунковыя кніжкі калгасьнікаў"

За 15 дзён месячніка

38 калгасаў наладзілі ўлік працы

У бліжэйшыя дні завесьці дакладны ўлік у астатніх 15 калгасах

ШКЛОЎ.

За 15 дзён месячніка генэральнай праверкі па ўсіх калгасах раёну арганізаваны праверачныя камісіі. Для арганізацыі праверкі ў сельсаветы і калгасы было накіравана 55 раённых работнікаў.

На 5 жніўня па 12 калгасах зьдзельшчына яшчэ ня ўжываецца. Працоўныя кніжкі калгасьнікам выданы толькі па 165 калгасах. Запіс працадзён у кніжкі калгасьнікаў праводзіцца па 158 калгасах (у раёне 173 калгасы).

Слаба разгорнута падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю ільну па раёне. На 5-е жніўня не пабудавана ні аднаго мяльна-сушыльнага пункту, не падрыхтаваны кадры па ўборцы і першапачатковай апрацоўцы ільну. Да загатоўкі апалу для ільнасушыльных пунктаў раён яшчэ не прыступіў.

Падзёншчына і кулацкая ўраўнілаўка

КЛІЧАЎ. **З 121 калгасу Клічаўскага раёну толькі ў двох калгасах** (Клічаўская камуна і калгас «Дубна») **наладжан улік працы. У астатніх калгасах у справе арганізацыі працы панае поўная неразьбярыха.**

У радзе калгасаў пасьля абмалоту жыта ссыпаецца ў склады няважаным. Такім чынам, калг

Каменшчык Дворкін пабіў сусьветны рэкорд кладкі цэглы

АГЛЯД ДРУКУ

9000 ЦАГЛІН ЗА 3 ГАДЗІНЫ, 24000--ЗА 8-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ

КАМЕНШЧЫКІ БССР, ПЕРАД ВАМІ БАЯВАЯ ЗАДАЧА: АУЛАДАЦЬ МЭТАДАМІ РАБОТЫ тав. ДВОРКІНА, ВЫШЭЙ ХВАЛЮ ВЫТВОРЧАГА ЭНТУЗІЯЗМУ, КАНКРЭТНАГА СПАБОР НІЦТВА ПА ПРАФЭСІЯХ

ТОЛЬКІ ЗАЎЧОРА ЎДАРНІКІ №-СКАГА ВАЕННАГА КІРАЎНІЦТВА БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ РАПАРТАВАЛІ АБ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОЗЕ НА ФРОНЦЕ БУДАЎНІЦТВА: МАЛАДЫ КАМЕНШЧЫК ТАВ. **ЛАГУЦІН, КАМСАМОЛЕЦ**, З ДАПАМОГАЙ ГРУПЫ ЧОРНАРАБОЧЫХ У 5 ЧАЛАВЕК **УКЛАЎ** ЗА 5 ГАДЗІН З МІН. **10.964 ЦАГЛІН**, ШТО СКЛАДАЕ **16.016** ШТУК ЗА 8-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ. КАМСАМОЛЕЦ ЛАГУЦІН ПАБІЎ УСЕСАЮЗНЫ РЭКОРД КЛАДКІ ЦЭГЛЫ, ПЕРАВЫСІЎШЫ РЭКОРД СМАЛЕНСКІХ КАМЕНШЧЫКАЎ БОЛЬШ ЯК НА 3.000 ШТУК ЦАГЛІН.

УЧОРА, ВА ЎПАРТАЙ БАРАЦЬБЕ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЛЕЗУНГУ ПАРТЫІ — ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ ТЭХНІКУ ПЕРАДАВЫХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН, КАМЕНШЧЫК **ДВОРКІН**, ЯКІ МАЕ 36-ГАДОВЫ СТАЖ БЕСЬПЕРАПЫННАЙ РАБОТЫ, ТАКСАМА З ДАПАМОГАЙ ПЯЦІ РАБОЧЫХ, УКЛАЎ НА ПАБУДОВЕ ДОМУ АКАДЭМІІ НАВУК **ЗА 3 ГАДЗІНЫ РАБОТЫ ЗВЫШ 9.000 ШТУК ЦАГЛІН**, ШТО СКЛАДАЕ **ЗА 8-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ 24.000 ЦАГЛІН.**

ГЭТЫМ ТАВ. ДВОРКІН ПАБІЎ **СУСЬВЕТНЫ РЭКОРД**. РАБОТА ШЛА НА ЗВЫЧАЙНАЙ КЛАДЦЫ З НІШАМІ ДЛЯ-РАДЫЯТАРАЎ (КЛАДКА З АДНАГО БОКУ) НА ВЫШЫНІ ДРУГОГА ПАВЕРХУ.

ЗНАЧЭННЕ ГЭТАЙ ПЕРАМОГІ БУДЗЕ БОЛЬШ ЯСНЫМ, КАЛІ ЎСПОМНІЦЬ, ШТО ШТОДЗЕННАЯ НОРМА КЛАДКІ ЦЭГЛЫ НА АДНАГО КВАЛІФІКАВАНАГА КАМЕНШЧЫКА СКЛАДАЕ 900 ШТУК І ШТО НЯМЕЦКАЯ НОРМА СКЛАДАЕ 2.400 ШТУК НА АДНАГО ЧАЛАВЕКА. МІЖ ТЫМ РЭКОРД ТАВ. ДВОРКІНА ДАЕ Ў СЯРЭДНІМ ПА **4.000 ЦЯГЛІН НА ЧАЛАВЕКА**, УКЛЮЧАЮЧЫ ЧОРНАРАБОЧЫХ.

ТАК, ДЗЯКУЮЧЫ ВЫСОКАМУ ЭНТУЗІЯЗМУ, ЎДАРНІЦТВУ, КАНКРЭТНАМУ СНАБОРНІЦТВУ ПА ПРАФЭСІЯХ, — РАБОЧАЯ КЛЯСА САВЕЦКАГА САЮЗУ АЎЛАДАЕ ВЫШЫНЯМІ ТЭХНІКІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ПАСЬПЯХОВА ВЫРАШАЕ ЛЕЗУНГ «ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ У ТЭХНІКА-ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСНАХ ПЕРАДАВЫЯ КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ».

НАПЕРАД, ТАВАРЫШЫ, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

т. Гізун—ударнік Бабруйск. камбінату.

Аб разьвешаных плякатах і задачах клёўна Жоржа

«Асаблівай увагі» заслугоўвае дыванны клёўн Жорж. Яго нумары бязумоўна... самыя нікудышныя. Прыходзіцца толькі зьдзіўляцца таму, што адміністрацыя цырку да гэтага часу дазваляе яму працаваць так.

Задача дыванага клёўна Жоржа заключэцца ў тым, каб весела, здаровым сьмехам запоўніць час памін розными нумарамі. Ці спраўляецца цяперашні клёўн Жорж са сваімі задачамі? Бязумоўна не. Яго «дасьціпнасьць» нічога ня мае супольнага са здаровым гумэрам і сатырай.

Апрача пагардлівай усьмешкі граблям, якімі ён чэша галовы служачых, ён нічога іншага не заслугоўвае. Нас вспабанілі ад ня менш «удалага» Якабінкі, зараз трэба вспабаніць і ад Жоржа» («Савецкая Беларусь» ад 26 чэрвеня).

Вы захоплены, вы пераможаны. Якая рэзкая крытыка, якое вычэрпанае акрэсьленьне задач клёўна Жоржа.

Дзіўна толькі, што **«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»**, якая прысьвячае нямала радкоў клёўнам Жоржам і іх мыцкодушным крытыкам, анапшла магчымым зусім зьняць са сваіх старонак аддзел партыйнага будаўніцтва.

Няма слоў, чарговых задач даволі многа: тут і ўборачная кампанія, і перабудова каапэрацыі, і падрыхтоўка да асенняй сэўбы. Але гэта не азначае, што «С. Б.» не павінна займацца такімі **АСНОЎНЫМІ І ВАЖНЕЙШЫМІ ПЫТАНЬНЯМІ**, як партыйнае будаўніцтва, партыйная работа.

«Ажыцьцяўленьне дырэктыў XVI зьезду і ЦК УсеКП(б) аб паваароце партарганізацый тварам да вытворчасьці, аб перанясеньні цэнтру цяжару партработы ў цэх і брыгаду значна павысіла ўдзел партарганізацыі ва ўсім гаспадарча-палітычным жыцьці прадпрыемстваў, забясьпечыла далейшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод шырокіх мас, забясьпечыла далейшы вылізарны ўзрост партыі за лік рабочых з вытворчасьці».

Так 26 сакавіка г. г. ЦК УсеКП(б) адзначыў ролю перабудовы партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах. Нядаўна было апублікавана палажэньне аб сельскай і калгаснай ячэйцы, якое ЦК партыі ставіць на абгаворваньне сельскіх партыйных арганізацый.

Ідзе вялікарная перабудова работы ўсіх нашых партыйных арганізацый. Адбываецца магутны рост партыі, пагодзенна на аснове посьпехаў сацыялістычнага наступленьня новыя тысячы ударнікаў уступаюць у яе рады.

Камсамол пераўтвараецца ў шматмільённы, выконваючы лёзунг IX зьезду УсеЛКСМ аб удзячэньні да МЮД'у 100 проц. рабочай моладзі ў свае рады.

«Савецкая Беларусь», маючы, між іншым, значныя дасьпяхі ў перабудове сваёй работы, на працягу апошніх месяцаў (май-ліпень) **ЗУСІМ ЗАБЫЛА АБ ГЭТЫХ БАЯВЫХ ЗАДАЧАХ.**

Ліпень паўтараць, якое найвялікшае палітычнае значэньне мае справаздачна-перавыбарчая кампанія партыйных органаў. Справаздачна-перавыбарчая кампанія выклікала магутны ўздым вытворчай і палітычнай актыўнасьці партыйных і рабочых мас на заводах і фабрыках, у саўгасах і калгасах. Перавыбары партарганаў праходзяць у жорсткай барацьбе на два фронты супроць правых і «левых» апартуністаў.

Дарэмна вы пералічаеце трохмесячны камплект «Савецкай Беларусі». Проста ня верыцца, што газэта магла прапусьціць **МІМА** сябе такую важнейшую палітычную кампанію.

Толькі 28-га ліпеня «С. Б.» зьмясьціла падборку пад аншлягам:

— ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЎЗНАЧАЛІЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ДРУГІ БАЛЬШАВІЦКІ ЎРАДЖАЙ.

Ці ня мала гэтага для цэнтральнай газэты?

«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» АБАВЯЗАНА БЫЛА на сваіх старонках сыстематычна і пасьлядоўна паказваць практычна і пасьлядоўна паказваць практычны **ЎДЗЕЛ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ПЕРАБУДОВЕ САВЕТАЎ.** Просты абавязак газэты сыстематычна засьвятляць патыньні партыйнага кіраўніцтва работай саветаў, памятаючы, што ня ўсякая работа саветаў—адна лінія партыі і лінія саветаў—адна лінія». Нічога падобнага газэта **НЕ ЗРАБІЛА.**

Аддзел партыйнага будаўніцтва бясьсьледна ізьнік са старонак газэты. Ці ня ўсе ўпартым маўчаньнем «С. Б.» абыходзіць упартым маўчаньнем пытаньні партыйнага будаўніцтва, ибыта для іх у газэце няма месца. На гэта радзіцца «Савецкай Беларусі» скаргдзіцца ня можа. Хапае-ж у газэце месца для крытыкаў дыванага клёўна Жоржа.

***

«РАБОЧИЙ» — масавая рабочая газэта ЦК КП(б)Б. Змагацца за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове партыйна-масавай работы — яго **ПЕРШАЧАРГОВАЯ ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА.**

Варта пералічыць падборкі, якія дала газэта аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў — 2-га чэрвеня, 27-га чэрвеня і 3-га ліпеня (аб якасьці іх ніжэй); жаб пераканацца, што «Рабочий», на жаль, **НЕДАЦАНІЎ** гэтага важнейшага пытаньня.

«Па цэхах разьвешаны плякаты, якія заклікаюць рабочых да ўдзелу ў перавыборах. Вядзецца сыстэматычная работа па выяўленьні лепшых ўдарнікаў і прамільваньні лепшых ударнікаў» («Рабочий» ад 2 чэрвеня).

Такая павархоўнасьць нярэдка пратлядае ў матар'ялах, якія зьмяшчае «Рабочий» па пытаньнях партыйнага будаўніцтва.

27-га чэрвеня ў заметцы аб ходзе перавыбараў парторганаў па Барысаўскай арганізацыі «Рабочий» спакойна рэгструе факты:

«...На фабрыках «Прафінтэрн» і «Камінтэрн» — паўнейшая сьпячка, ячэйкі адарваны ад шырокіх рабочых мас...»

Але, тутарка-ж ідзе аб буйных заводзкіх калектывах аднаго з асноўных індустрыяльных цэнтраў БССР. Пытаньне трэба паставіць на прынцыповую вышыню. Калі гэтыя ячэйкі сапраўды «адарваны ад шырокіх рабочых мас», трэба выявіць сапраўдны твар кіраўніцтва гэтых ячэек, паказаць, што на чале іх стаіць не бальшавікі, а апартуністы, мабілізаваць партарганізацыю на барацьбу з апартуністычнай практыкай.

У адным са сваіх нумароў «Рабочий» сьцьвярджае, што Магілеўская тэкстыльная фабрыка выканала свой прамфінплян толькі на... 47 проц. Над заметкай аб гэтым гнабіцельным факце газэта дае наступны сэнсацыянальны аншлаг:

— Сорамна Магілеўскім тэкстыльнікам адставаць.

Чаго варта такая пастаноўка пытаньня. Замест пэнтырыянскага палажэньня газэта павінна была вывярыць кароткі працаапартуністычнай практыкі, выявіць якой насумнелай зьдзяўленьцы аддзяленьня зрыву прамфінплану на фабрыцы.

«Рабочий» не вядзе ўпартай і сыстэматычнай барацьбы за перабоўку перадавых ударнікаў, рабочых і работніц на варштат у рады КП(б)Б.

— МЕНСК, ВІЦЕБСК, ГОМЕЛЬ, РЭЧЫЦА, БАРЫСАЎ — ЗЬНІЗІЛІ ТЭМПЫ ВЯРБОЎКІ Ў ПАРТЫЮ, — сьцьвярджае «Рабочий» у нумары ад 30-га ліпеня. Вина за гэта ў пэўнай меры ажыцьцяўляе і на газэце «Рабочий». Газэта за апошні час (май-ліпень) вакінула поза сваёй увагай пытаньні росту КП(б)Б. Газэта не разгарнула барацьбы за вярбоўку ў рады партыі лепшых ударнікаў, герояў сацыялістычнай працы, задавальняючыся зьмешчэньнем адных хранікёрскіх заметак аб росьце.

***

Друк абавязан рашуча ўзмацніць глыбокае і сыстэматычнае асьвятленьне ўсіх бокаў і сыстэматычнае асьвятленьне ўсіх пытаньняў партыйнага будаўніцтва разгарнуўшы масавую АРГАНІЗАТАРСКУЮ і апэрацыйную работу. Газэты павінны і, у першую чаргу «РАБОЧИЙ» і «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» штодзённа і ўпарта змагацца за перабудову партыйнай і масавай работы на основе пастановы Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і дырэктыў ЦК КП(б)Б.

ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ

паставіць у рад важнейшых вучасткаў культурнага фронту

Безадкладным стварэньнем дашкольнай каапэрацыі, шырокай мабілізацыяй грамадзкіх сіл і сродкаў для правядзеньня ўсеагульнага дашкольнага выхаваньня—забясьпечым выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б

Дашкольнае ўсеагульнае навучаньне паставіць на рэйкі баявой работы

Дашкольнае выхаваньне зьяўляецца адным з найбольш забытых вучасткаў нашага культурнага фронту. Гэты вучастак увесь час знаходзіцца па-за сфэрай увагі савецкай грамадзкасьці, і нават, як гэта ня дзіўна, яму аддаецца вельмі мала увагі органамі НКА.

А між тым гэты вучастак культурнага фронту мае вялізарнае значэньне, якое ўзрастае штараўна з кожным днём. Без павялічэньня можна сказаць, што пытаньне аб ўцягненьні жанчын у вытворчасьць упраецца зараз у арганізацыю грамадзкага выхаваньня дзяцей. А аб тым, якое значэньне мае ўцягненьне жанчын у вытворчасьць, для пашырэньня праблемы кадраў для нашай прамысловасьці — наўрад ці трэба гаварыць.

Становішча, якое мы маем на сёньняшні дзень са справай дашкольнага выхаваньня, наўрад ці могчы прызвець здавальняючым і чалавек, які на ўсё глядзіць праз ружовыя акуляры.

Усімі дашкольнымі Установамі (у 1930-31 г. іх налічваецца 2.426) ахоплена 74.500 дзецей, г. зн. **усяго 13 проц.** усіх дзяцей дашкольнага ўзросту. Нават дзеці работніц ахоплены нашымі дашкольнымі ўстановамі толькі на 50%. Аднак і гэтыя лічбы не даюць прадстаўленьня аб сапраўдным становішчы справы дашкольнага выхаваньня. Неабходна мець на ўвазе, што больш чым палова дашкольных установ зьяўляюцца часовымі (пляцоўкі і г. д.), г. зн. функцыянуюць толькі некалькі месяцаў у год.

Такое становішча справы дашкольнага выхаваньня ня толькі тармозіць далейшае ўцягненьне жанчын у вытворчасьць, але нават стаіць пад пагрозу і выхаваньне існуючых жаночых кадраў.

У апошні час нярэдкі выпадкі, калі жанчыны адмаўляюцца ад работы ў прадпрыемствах і ўстановах, прычым звычайным матывам зьяўляецца «няма на каго пакінуць дзіця». Адсутнасьць грамадзкага выхаваньня зьяўляецца таксама фактарам, спрыяючым упадку працоўнай дысцыпліны, росту прагулаў, спазьненьняў сярод жанчын-работніц і г. д.

Такое становішча з дашкольным выхаваньнем нельга далей цярпець літаральна віводнага дня.

Партыя, камсамол, прафсаюзы, савецкія органы павінны ўзяцца за гэту справу і ў найкарацейшы тэрмін пасунуць яго наперад баявымі тэмпамі.

Гэта патрабуе зьмешчанай сёньня пастановы Цэнтральнага Камітэту партыі.

У гэтай пастанове ЦК КП(б)Б высуноўвае задачу ўвядзеньня **абавязковага дашкольнага навучаньня** ў Беларусі. У той час, як у справе ўвядзеньня ўсеагульнага (школьнага) навучаньня, Беларусь увесь час ішла ў першых радах, з дашкольным навучаньнем мы адстаем. Мы павінны ва што-б там ні стала дабіцца ліквідацыі гэтага адставаньня; мы павінны дабіцца таго, каб і тут ісьці ў першых радах. Вопыт увядзеньня ўсеагульнага навучаньня трэба перанесьці і на работу па дашкольным навучаньні. Тэмпы, вызначаныя ЦК, зусім рэальныя. Ахапіць у бліжэйшым годзе 50% усіх дзяцей і сярод іх усіх дзяцей работніц разгарнуць работу такімі тэмпамі, каб да канца пяцігодкі поўнасьцю закончыць правядзеньне ўсеагульнага дашкольнага навучаньня — гэта задача можа і павінна быць выканана.

Увядзеньне ўсеагульнага дашкольнага навучаньня, натуральна, патрабуе значных матар'яльных затрат. Без падтрыманьня прафсаюзаў, без падтрыманьня гаспадарчых арганізацый, без іх актыўнага ўдзелу, гэтую справу далёка пасунуць нельга.

Да гэтага часу мы маем, на жаль, самыя недапушчальныя адносіны гаспадарчых органаў да гэтай работы.

З-за бюракратычных адносін органаў забясьпячэньня ў гэтым годзе сарваны планы арганізацыі летніх пляцовак для дзяцей. Мы ў гэтым годзе ў Менску маем у два разы менш пляцовак, чым у мінулыя гады, і маса пралетарскіх дзяцей правядзе гэта гарачае лета на пыльных і брудных вуліцах гораду.

Ці другі прыклад: Белкаапсаюз, перадаючы свае дашкольныя ўстановы органам НКА, парашыў на гэтай справе «з'эканоміць» і зэкмест 178.000 руб., намечаных на плане на ўтрыманьне сеткі дашкольных установ, перадаў НКА толькі 78.000 руб. Дзякуючы гэтаму, перададзеныя НКА дашкольныя ўстановы стаяць зараз пад непасрэднай пагрозай закрыцьця, і гэта ў той момант, калі партыя высоўвае задачу максымальнага паскарэньня тэмпаў разгортваньня дашкольнай сеткі.

Гэта толькі асобныя, і больш-менш яркія, прыклады адносін нашых гаспадарчых органаў да справы дашкольнага выхаваньня. Мы маем рад фактаў, калі асобныя прадпрыемствы, гаспадарчыя аб'яднаньні, калгасы, райкалгасаюзы, саўгасы і г. д. сваімі адносінамі да дашкольных установ прыводзілі да іх ліквідацыі.

Нам здаецца, што даказаць усю шкодласьць такой «палітыкі», зразумела, ня прыходзіцца. Мала быць блізарукім, трэба быць сьляпым, каб ня бачыць непасрэднай сувязі паміж разгортваньнем дашкольнай сеткі і забясьпячэньнем кадрамі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Трэба быць сьляпым, каб ня бачыць, што эканомячы тысячы руб. на дзіцячых установах, мы трацім дзесяткі і сотні тысяч на недазваце рабочай сілы, на прагулах, спазьненьнях работніц і г. д.

Пастанова ЦК, мы ўпэўнены, створыць рашучы пералом у адносінах гаспадарчых органаў да справы грамадзкага выхаваньня дзяцей. Гаспадарчыя органы зразумеюць, нарэшце, іх непасрэдную зацікаўленасьць у гэтай рабоце і дапамогуць хутчэйшаму ажыцьцяўленьню дашкольнага ўсеагульнага навучаньня.

Аднак, для пасьпяховага правядзеньня мала дапамогі гаспадарчых органаў. Неабходна прыцягнуць да гэтай справы самыя шырокія пласты працоўнага насельніцтва.

Без самадзейнасьці працоўных мас, іх ініцыятывы, без мабілізацыі сродкаў насельніцтва, мы не пасунем неабходнымі тэмпамі справу дашкольнага ўсеагульнага навучаньня.

Лепшай формай для ўцягненьня мас насельніцтва ў будаўніцтва дашкольных устаноў (а таксама і ясьлянь)—зьяўляецца каапэраваньне насельніцтва — прадугледжанае пастановай ЦК, стварэньне дашкольнай каапэрацыі. Арганізацыя ясьлянь і дашкольных установ на каапэрацыйных пачатках ужо даўно практыкуецца ў радзе гарадоў Савецкага Саюзу (у прыватнасьці ў Маскве) і поўнасьцю сябе апраўдала.

Мы павінны ўзяцца за гэту справу, не адкладаючы ні мінуты. Глеба для работы тут самая ўдзячная. Ня можа быць сумненьня ў тым, што масы працоўнага насельніцтва вельмі ахвотна адгукнуцца на заклік да стварэньня дашкольнай каапэрацыі. Трэба толькі разгарнуць ініцыятыву мас, даць першы штурчок, — а потым мы з асяродзішча саміх жанчын работніц, служачых, жонак рабочых і г. д. атрымаем вельмі добрых арганізатараў, будаўнікоў дашкольнай каапэрацыі, энтузіястаў справы дашкольнага ўсеагульнага навучаньня.

Правядзеньне ўсеагульнага дашкольнага навучаньня патрабуе вялізарнага павялічэньня кадраў дашкольных работнікаў. Гэта, бадай, найбольшая цяжкасьць, якую сустракае работа на разгортваньні сеткі дашкольных установ.

Між тым, падрыхтоўка дашкольных кадраў знаходзіцца цяпер у агідным становішчы. На ўсю Беларусь месцца цяпер усяго толькі адзін дашкольны тэхнікум, ды і таму, на жаль, аддаецца вельмі мала ўвагі і, што яшчэ горш, мала сродкаў. Прыём у гэты тэхнікум знаходзіцца пад пагрозай зрыву з-за поўнай адсутнасьці інтэрнату.

НКА, пры падтрыманьні аднаведных органаў, павінен ва што-б там ні стала забясьпечыць ня толькі максымальна павялічаны прыём у існуючы тэхнікум, але і адкрыцьцё раду новых дашкольных тэхнікумаў ці дашкольных аддзяленьняў пры існуючых педтэхнікумах.

Але гэта мерапрыемства дасьць эфэкт толькі праз 2-3 гады, а нам патрэбны вялізарныя кадры ўжо зараз. Таму неабходна сьмелае высоўваньне на дашкольную работу работніц, калгасьніц і асабліва незанятых на вытворчасьці жонак рабочых. Стварэньне кароткатэрміновых курсаў для вылучэньня, стварэньне іх у найкарацейшы тэрмін, пры поўным укамплектаваньні—гэта зьвяно, за якое мы павінны зараз ухапіцца, каб забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК.

Побач з максымальным павялічэньнем колькасьці дашкольных установ (і процанту ахопу дзяцей), перад намі паўстала задача паляпшэньня якасьці іх работы. Тая якасьць работы дашкольных установ, якую мы маем цяпер, нас задаволіць ніяк ня можа.

Адной з галоўных прычын тут зьяўляецца, зразумела, невыстарчальная кваліфікацыя педагагічнага пэрсаналу. Але побач з гэтым, зьнижаюць якасьць работы і рад іншых момантаў і, у першую чаргу, адлічная пастаноўка забясьпячэньня дзіцячых установ. Дашкольныя інспэктары ў гарадох, кіраўнікі дзіцячых садоў павінны літаральна ўвесь час і ўсе свае сілы трацілі на вырашэньне пытаньняў забясьпячэньня. Для мэтадычнага кіраўніцтва, для пастаноўкі пэдагагічнай работы ў іх не застаецца часу. Нельга гэтыя акалічнасьці тлумачыць недахопам матар'ялаў, прадуктаў і г. д. Вядо ў тым, што мы на вздолелі арганізаваць забясьпячэньня дзіцячых установ і тым, што мы маем, тым, што для іх прызначаецца, тым, што яны нарэшце пасьля бясконцай сумяніцы і траты ўсяго рабочага часу іх кіраўнікоў, атрымліваюць. Упарадкаваньне забясьпячэньня — гэта першая ўмова паляпшэньня якасьці работы дзіцячых установ.

Пастанова ЦК намячае рад канкрэтных мерапрыемстваў, выкананьне якіх забясьпечыць росквіт справы дашкольнага выхаваньня. Гэта пастанова мае вялізарнае значэньне ня толькі для нашага культурнага фронту, але і для разьвіцьця нашай гаспадаркі. Усе арганізацыі, на якія ЦК усклаўдзены пэўныя абавязацельствы, павінны базадкладна ўзяцца за іх рэалізацыю.

Камсамол, які кроўна зацікаўлен у гэтай справе, павінен узяць над сваёй нагляд выкананьне пастановы ЦК. Ён павінен вылучыць брыгады, якія будуць правяраць выкананьне асобнымі установамі заданьняў ЦК. Ён павінен ажыцьцяўленьне дашкольнага ўсеагульнага навучаньня зрабіць баявой задачай сваіх арганізацый.

Пастанова ЦК, насумненна, выкліча ўдым энэргіі і ініцыятывы дашкольных работнікаў. Працуючы ў самых цяжкіх умовах, аспэўная маса нашых дашкольніц праявіла выключную адданасьць рабоце і самаадданасьць. У першай культэстафэце дашкольніцы Менску выйшлі адным з першых. Мы ня сумніваемся, што цяпер яны з усёй энэргіяй, з усім энтузіязмам возьмуцца за ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК КП(б)Б,—задачы ажыцьцяўленьня ўсеагульнага дашкольнага навучаньня.

Да канца пяцігодкі ніводнага дзіцяці па-за школьнымі ўстановамі, ні адной маткі, якая адмаўляецца ад работы, таму што няма на каго пакінуць дзіця;— вось лёзунг, ажыцьцяўленьне якога будзе азначаць вялізарную перамогу на культурным фронце, перамогу, якая даволіць паскорыць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, тэмпы індустрыялізацыі нашай краіны.

Е. РЫЎЛІН.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця дашкольнага выхаваньня

Неабходнасьць далейшага ўцягненьня працоўных жанчын у вытворчае і грамадзкае жыцьцё краіны патрабуе асаблівай увагі да пытаньня бытавога разгруз'неньня іх і ў першую чаргу арганізацыі грамадзкага камуністычнага выхаваньня дзяцей. Гэтая задача набывае зараз вялізарнае народна-гаспадарчае значэньне і палітычную актуальнасьць у сувязі з недахватам рабочай сілы і неабходнасьцю шырокага ўцягненьня жанчын у вытворчасьць.

Між тым, становішча з разгортваньнем сеткі дашкольных установ і барацьбы за паляпшэньне якасьці работы ў іх, знаходзіцца ў яўна нездавальняючым стане. Усімі відамі школьных і дашкольных устаноў ахоплена толькі 13 процантаў дзяцей працоўных. Рад грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый (Наркамснаб, Белкаапсаюз, Калгасцэнтр, ВСНГ) зусім няўважлівыя адносіны да задач дашкольнага выхаваньня, і недаацэньваюць ролі разгортваньня дашкольнага выхаваньня ў выкананьні гаспадарчых задач. З боку некаторых мясцовых партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый і ў першую чаргу органаў Нарасьветы маюцца апартуністычныя адносіны да школьнай справы.

Выходзячы з гэтага ЦК пастанаўляе:

1. Даручыць НКА і Дзяржпляну не пазьней 1-га кастрычніка 1931 году скласьці плян увядзеньня ў БССР усеагульнага дашкольнага выхаваньня з тым, каб у 1932 годзе ахапіць ня менш 50 проц. усіх дзяцей дашкольнага ўзросту, у тым ліку ўсіх дзяцей рабочых.

У першую чаргу планам павінна быць прадугледжана разгортваньне дошкольных установ пры прадпрыемствах з перавагай жаночае працы. Дзеці дашкольнага ўзросту прымежных раёнаў сусэдзкай калектывізацыі павінны быць ахоплены дашкольнымі ўстановамі таксама ў 1932 г.

2. НКА разам з ЦСПСБ і Калгасцэнтрам не пазьней 1-га кастрычніка правесьці рэарганізацыю ўсёй сыстэмы дашкольнага выхаваньня, поўнасьцю прыстасаваўшы яе да патрэб вытворчасьці (увядзеньне трохзьменнасьці, вячэрніх і начных груп, поўнага пераводу іх на бесьперапынны тыдзень і г. д.).

3. У мэтах прыцягненьня грамадзкіх сіл і сродкаў для будаўніцтва дашкольных установ і ясьлянь арганізаваць дашкольную каапэрацыю. НКА, ЦСПСБ неадкладна распрацаваць формы арганізацыі і зьмест работы гэтай каапэрацыі, унёсшы гэтыя палажэньні на зацьвярджэньне СНК БССР.

4. Прызнаць неабходным большы матар'яльны ўдзел грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый у справе дашкольнага выхаваньня. Даручыць Дзяржпляну, НКФіну пры ўдзеле НКА распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы з паказаньнем цьвёрдых сум, якія павінны быць асыгнаваны аднаведнымі гаспадарчымі і грамадзкімі арганізацыямі. ЦСПСБ, Белкаапсаюзу неадкладна ліквідаваць грашовую запазычанасьць на ўтрыманьне дашкольных установ.

5. Даручыць усім РК КП(б)Б, НКА, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ уключыць да школьнае выхаваньне ў адзін плян культурнага будаўніцтва, як важнейшую частку апошняга. Забясьпечыць на ўсёй рабоце па культпаходзе неабходную ўвагу дашкольнаму выхаваньню, шырока прыцягнуць грамадзкасьць да кантролю над працай дашкольных устаноў.

6. З мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для работы ў дашкольных установах даручыць НКА і Дзяржпляну значна пашырыць існуючую сетку дашкольных тэхнікумаў. Рашуча высоўваць на работу ў дашкольныя ўстановы калгасьніц, работніц і жонак рабочых, стварыўшы шырокую сетку курсаў па павышэньні іх кваліфікацыі. Стварыць дашкольнае аддзяленьне ў заочным пэдфаку і заочны дашкольны тэхнікум.

7. ВСНГ тэрмінова распрацаваць пляны пабудовы ў рабочых раёнах будынкаў для дашкольных установ, а таксама ўлічваць пры пабудове новых дамоў неабходнасьць забясьпячэньня дашкольных установ адпаведнымі памяшканьнямі. Белжылсаюзу вылучыць у ЖАКТах адпаведную плошчу для разгортваньня дашкольных установ, поўнасьцю выканаўшы абвод установленага процанту жыльпёвай плошчы (5 проц.) пад бытавыя ўстановы. Калгасцэнтру забясьпечыць абвод адпаведнай плошчы ў першую чаргу з ліку канфіскаваных кулацкіх будынкаў.

8. Наркамснабу і Белкаапсаюзу ўключыць у свае пляны забясьпячэньне дашкольных установ неабходнымі прадуктамі харчаваньня, адзеньнем і абсталяваньнем.

9. Прапанаваць ВСНГ і Белсампрамсаюзу арганізаваць выраб палітэхнічных прылад для дашкольных установ, стандартнага абсталяваньня і выраб цацак у разьмерах, забясьпечваючых патрэбу ў іх. НКА забясьпечыць належны пэдагагічны кантроль і кіраўніцтва гэтай работай.

10. У мэтах паляпшэньня матар'яльна-прававога становішча дашкольных працаўнікоў прыраўняць іх у нормах забясьпячэньня і культурна-бытавога абслугоўваньня да настаўнікаў школ сацвыху.

11. Даручыць БДВ, БелАПП'у, НКАсьветы нападзіць работу па выданьні масавай дзіцячай літаратуры. Узмацніць выданьне яе на нац. мовах. Мэтэдному НКА нападзіць выпуск аднаведных мэтадычных матар'ялаў па дашкольным выхаваньні.

12. Прапанаваць НКА распрацаваць плян арганізацыі дзіцячых гарадкоў пры буйных пралетарскіх цэнтрах з тым, каб у будучым годзе пачаць іх будаўніцтва.

13. Усім РК КП(б)Б праверыць становішча работы па абслугоўваньні дзяцей дашкольнага ўзросту і забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну разгортваньня дашкольных установ на гэты год.

14. Улічваючы вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне дашкольнага выхаваньня даручыць сэктару Друку забясьпечыць зьмяшчэньне ў газэтах раду артыкулаў па гэтым пытаньні.

Бараноўскі выехаў у адпачынак...

ДУБРОЎНА, 6 жніўня. (Белта).

Падрыхтоўка да новага навучальнага году ў раёне яшчэ не распачата. Большасьць школ да пачатку навучаньня ня будзе пабудавана. Рамонт школ не разгорнут.

Райвыканком і грамадзкія арганізацыі зусім не займаюцца пытаньнямі падрыхтоўкі да навучальнага году, не правяраюць становішча будаўніцтва і ня прымаюць ніякіх мер да таго, каб школы былі пабудаваны своечасова. Інспэктар Нарасьветы БАРАНОЎСКІ, не правёўшы ніякай падрыхтоўчай работы, выехаў у адпачынак

ДЭФІЦЫТНЫЯ БУДАЎНІЧЫЯ МАТАР'ЯЛЫ ЗА ПРАЦЯГУ НЕКАЛЬКІХ ГОД ЛЯЖАЦЬ НЕСКАРЫСТАНЫМІ. ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАЯ школа, ня гледзячы на тое, што ёсьць усе патрэбныя будаўнічыя матар'ялы, у гэтым годзе ня будзе скончана, бо будаўніцтва яшчэ не распачата. Казьмянская школа будуецца ўжо 5 год...

Дзесятніні па будаўніцтве літаральна бязьдзейнічаюць. Навучальны год бязьдзейнасьцю райвыканкому і партыйных ячэек пастаўлен пад пагрозу зрыву.

У дэкадзнік індустрыялізацыі ліквідаваць прарывы у рэалізацыі пазыкі

БАРЫСАЎ.

Па Барысаўскім раёне ўдарная дэкада рэалізацыі пазыкі фактычна правалена. Даволі сказаць, што да гэтага часу ня скончана яшчэ нават падпіска сярод рабочых і служачых.

Зусім дрэнна стаіць справа на вёсцы. Сярод аднаасобнікаў рэалізавана толькі 8,5% заданьня. Бясковыя партыйныя ячэйкі, сельсаветы і камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і апчадсправе нічога не зрабілі, каб скончыць кампанію ў вызначаны тэрмін.

У бліжэйшыя дні трэба дабіцца карэннага зруху ў ходзе рэалізацыі пазыкі. Дэкадзнік індустрыялізацыі павінен быць выкарыстаны раённымі арганізацыямі для максымальнага ўзмацненьня ходу падпіскі. Сельпартыкомы і камісіі садзейнасьці павінны разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і сярэднякоў аб значэньні рэалізацыі пазыкі.

Перадавыя калгасы і прадпрыемствы павінны ўзяць на буксір адстаючыя, вылучыць брыгады рабочых і калгаснікоў і паслаць іх па месцы для ліквідацыі прарываў.

Я. БУЗО.

ДЭКАДНІК ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

НА АСНОВЕ ЎКАЗАНЬНЯЎ т. СТАЛІНА УЗМАЦНІЦЬ УВАГУ МАТАР'ЯЛЬНА-БЫТАВОМУ АБСЛУГОЎВАНЬ

„НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ“

„ПЛЯН ПАВЯЛІЧВАЕМ“

Калгасы Капыльшчыны абвясьцілі сябе ўдарнікамі збожжазагатовак

ЯНЫ ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК, ПАВЯЛІЧЫЎШЫ ЗАДАНЬНЕ на 15%

Калгасьнікі і аднаасобнікі БССР! Падхапеце ініцыятыву калгасаў Капыльскага раёну

АДОЗВА

КАЛГАСЬНІКАЎ КАПЫЛЬСКАГА РАЁНУ ДА ЎСІХ КАЛГАСАЎ БССР

ТАВАРЫШЫ! МЫ ЎСТУПІЛІ Ў ПАЛАСУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, ЯКІЯ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА АДНЫМ З ВАЖНЕЙШЫХ ЗЬВЕНЬНЯЎ УСЯГО НАШАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

«РАШАЮЧЫЯ ПЕРАМОГІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, РОСТ САЎГАСАЎ І МТС, ВЫСОКІ ПРОЦАНТ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СЭКТАРЫ СТВАРАЮЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ШПАРКАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК І АДНАЧАСОВА ВЫВАЗУ ЗБОЖЖА ДА ПРЫСТАНЦЫЙНЫХ ПУНКТАЎ І ЭЛЕВАТАРАЎ» (З ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ).

У БССР ЕСЬЦЬ УСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ МАКСЫМАЛЬНАГА ЎШЧЫЛЬНЕНЬНЯ ТЭРМІНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. МЫ АБАВЯЗАНЫ ПРАВЕСЬЦІ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ Ў МАКСЫМАЛЬНА КАРОТКІ ТЭРМІН, ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎШЫ ПЛЯН.

ДЛЯ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЭТАЙ АДКАЗЬНЕЙШАЙ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАДАЧЫ МЫ, КАЛГАСЬНІКІ КАПЫЛЬСКАГА РАЁНУ, АБВЯЩЧАЕМ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК І АБАВЯЗУЕМСЯ НЯ ТОЛЬКІ ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЦЬ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ.

КАЛГАСЫ НАШАГА РАЁНУ ПАВІННЫ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ Ў БЯГУЧУЮ ЗБОЖЖА-ЗАГАТОЎЧУЮ КАМПАНІЮ 1.220 ТОН ЗБОЖЖА.

МЫ ВЫСОЎВАЕМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК І ПАВЯЛІЧВАЕМ КАНТРОЛЬНУЮ ЛІЧБУ НА 15%. ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ І ВЫВЕЗЬЦІ НА ПРЫСТАНЦЫЙНЫЯ ПУНКТЫ ПОЎНАСЬЦЮ І ДАТЭРМІНОВА 1.403 ТОНЫ ЗБОЖЖА. ШЛЯХАМ ШЫРОКАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦ. СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫІ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ МЫ ДАБ'ЕМСЯ ПАСЬПЯХОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАГА СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ.

ТАВАРЫШЫ КАЛГАСЬНІКІ БССР! МЫ ЗАКЛІКАЕМ ВАС ПАДТРЫМАЦЬ НАШУ ІНІЦЫЯТЫВУ, ПАСЬЛЕДАВАЦЬ НАШАМУ ПРЫКЛАДУ, ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ДАТЭРМІНОВАЕ СКАНЧЭНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ КАЛГАСНЫМ СЭКТАРАМ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР КАНТРОЛЬНАЙ ЛІЧБЫ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ.

АЛЕ ГЭТАГА МАЛА. КАЛГАСЫ БССР ПАВІННЫ НЯ ТОЛЬКІ САМІ ПЕРАВЫКАНАЦЬ СВАЕ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ, ЯНЫ ПАВІННЫ ТАКСАМА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ КАМПАНІІ І Ў АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ.

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ БУДУЦЬ ПРАХОДЗІЦЬ ВА ЎМОВАХ АБВОСТРАНАЙ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ. КУЛАК ПРЫ ДАПАМОЗЕ СВАЁЙ АГЕНТУРЫ — ПРАВЫХ І «ЛЕВЫХ» АПАРТУНІСТАЎ, ШАЛЕНА ІМКНЕЦЦА САРВАЦЬ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ДАМО БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТАМ, ВЫКАНАЕМ І ПЕРАВЫКАНАЕМ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК.

МЫ ЗАКЛІКАЕМ УСЕ КАЛГАСЫ БССР ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, УЗЯЦЬ АДНААСОБНІКАЎ НА БУКСІР, ДАПАМАГЧЫ СЕЛЬСАВЕТАМ І МЯСЦОВЫМ ЗАГАТОЎЧЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ У ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ, КАБ НІ АДЗІН ЦЭНТНЭР ЗБОЖЖА НЯ ТРАПІЎ ДА ПРЫБАТНІКА.

КАЛГАСЫ КАПЫЛЬСКАГА РАЁНУ: «ЗЬВЯЗДА», «ШЛЯХ КАМУНЫ», ІМЯ КАРЛА МАРКСА, «ШТУРМАВЕЦ», ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА, «ПОЛЬСКІ КАМУНАР», «ПРАЦА», «ПРАЛЕТАРЫ», ІМЯ БЛЮХЕРА, «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ», ІМЯ XII-ГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІКА, «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», «БОТВІН», «ЧЫРВОНАЯ НІВА», «КУЛЬТУРА», «ПЕРАМОГА», ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, «ПРАЦАЎНІК», «СТАЛІНЕЦ», ІМЯ ГЕЯ, «ПАХАР» І «БАЛЬШАВІК».

Чырвоны абоз—у падарунак пленуму РВК

РЭЧЫЦА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

У ЧАСЕ РАБОТЫ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ РЭЧЫЦКАГА РВК І ГАРСАВЕТУ КАЛГАСЫ «ПАРАСТАК САЦЫЯЛІЗМУ», «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» І «СЬВЕТ» РАЗАМ З АДНААСОБНІКАМІ НАЛАДЗІЛІ ВЯЛІКІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ.

УСЯГО ЗДАНА ЗБОЖЖА 7.500 КІГР., НАСЕНЬН ЯЛЬНУ—1.256 КІГР., САДАВІНЫ І ГАРОДНІНЫ — 5.900 КІГР., МЕДУ — 500 КІГР. І СЕНА — 18.550 КІГР.

Уборка раньняй гароднины.

У Гарадку бяз зьмен

ГАРАДОК. На будаўніцтве Гарадоцкага 2-х турбіннага ільна-заводу — бяз зьмен. Вытворчы корпус павінен быць скончан да 15 жніўня. Плян ня выканан нават на 50 проц.

Райкалгассаюз ня выконвае дагавору аб забесьпячэньні будаўніцтва рабсілай У выніку—замест патрэбных 45 цесьляроў працуюць толькі 25.

Адсутнічае плянавасьць і сваячасовасьць у забесьпячэньні будматар'яламі. Няма толі і цьвікоў.

Віцебскі будаўнічы вучастак зусім ня цікавіцца якасьцю піламатар'ялаў, якія накіроўваюцца на будаўніцтва. Віцебскі лесазавод №13 даставіў дошкі дрэнная якасьці і непатрэбных разьмераў. Рэкорд галавацяцтва праявіў Бігосаўскі ільна-завод, які ў парадку перакідкі лішкаў матар'ялаў прыслаў Гарадоцкаму ільназаводу дзьве плятформы абрэзкаў будаўнічых матар'ялаў, якія зусім не падыходзяць для будаўніцтва і ня могуць быць выкарыстаны. Між тым перакідка гэтых абрэзкаў з Бігосава ў Гарадок каштавала ільнаканапляводбуду пекальких сотень рублёў. Такім недапушчальным зьявішчам трэба палажыць канец. Будаўнічы вучастак павінен узмацніць сваё кіраўніцтва будаўніцтвам ільназаводаў. М.

БАРАЦЬБА ЗА ТОРФ

Дубровенскі райкалгассаюз

арганізаваў сталінскі заклік калгасьнікаў у тарфяную прамысловасьць

Шырока скарыстаць сталінскі заклік калгасьнікаў-адыходнікаў для забесьпячэньня тарфяной прамысловасьці рабсілай

Па прыкладу „Дняпроўскай мануфактуры“, шляхам арганізацыі масавых суботнікаў рабочых, акажам пралетарскую дапамогу тарфяной прамысловасьці ў барацьбе за 700 тысяч тон торфу

Даць рабсілу тарфяному Данбасу

700 тысяч тон торфу павінна даць тарфяная прамысловасьць у 1931-рашаючым годзе пяцігодкі электрастанцыям, фабрыкам і заводам БССР.

Для пасьпяховага выкананьня гэтай праграмы торфаздабычы патрэбна 16.500 чалавек рабочых.

Тарфяная прамысловасьць БССР гэтай колькасьці рабочых ня мае. У чэрвені на торфараспрацоўках працавала усяго 3380 тарфяникаў і 2690 тарфяніц. Амаль такое становішча з рабочай сілай было і ў ліпені ў часе вынясэньня пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках якая адзначала «апартуністычны самацёк у вярбоўцы рабочай сілы на торфараспрацоўкі» і рашуча ставіла пытаньне аб поўным забесьпячэньні рабочай сілай торфараспрацовак.

Аднак матар'ялы з Сіроціна, Бабруйску і Быхава, якія сёньня зьмяшчаюцца у «Зьвязьдзе» і зьмяшчаліся раней, сьведчаць аб тым, што райарганізацыі шмат якіх раёнаў, ніякіх захадаў да выкананьня пункту пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках па пытаньні рабсілы ,ня прымаюць. Вярбоўка калгасьнікаў—адыходнікаў большасьцю раёнамі, дзе разгортваюцца торфараспрацоўкі—зрываецца.

У Белторфе і ЦП саюзу торфаспанцовай прамысловасьці таксама няма стараннага вучоту камплектаваньня торфазаводаў рабсілай, апошнія ня могуць даць дакладнага адказу колькі патрэбна рабочых для тарфяной прамысловасьці і колькі там зараз працуе.

А між тым адсутнасьць патрэбнай колькасьці рабсілы, слабое скарыстаньне маханізмаў і мэтадаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў практычнай работе на торфараспрацоўках, абязьлічка і ўраўніпаўка—зрываюць пасьпяховае выкананьне праграмы торфаздабычы.

Траба па прыкладзе «ДНЯПРОЎСКАЙ МАНУФАКТУРЫ» і Дубровенскага райкалгассаюзу ўзяцца за рэалізацыю пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках і ў першую чаргу забясьпечыць тарфяную прамысловасьць рабочай сілай.

ЗАРАЗ НЕАБХОДНА ШЫРОКА ВЫКАРЫСТАЦЬ РАЗГОРНУТУЮ КАМПАНІЮ СТАЛІНСКАГА ЗАКЛІКУ КАЛГАСЬНІКАЎ—АДЫХОДНІКАЎ НА ВЫТВОРЧАСЬЦЬ І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПРАВЕСЬЦІ ГЭТЫ ЗАКЛІК У ТАРФЯНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ, ЯКАЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНАЙ АПАЛАВАЙ БАЗАЙ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ БССР.

400 рабочых і 200 калгасьнікаў на дапамогу Асінторфу

ДУБРОЎНА, 8. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ФАБРЫКА «ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА» МАБІЛІЗАВАЛА НА АСІНТОРФ ДА 1-ГА ВЕРАСЬНЯ ДЛЯ ДАПАМОГІ Ў ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ 58 ЧАЛ. РАБОЧЫХ.

6-ГА ЖНІЎНЯ РАБОЧЫЯ АРГАНІЗАВАЛІ СУБОТНІК НА АСІНТОРФЕ, У ЯКІМ ПРЫМАЛА ЎДЗЕЛ 400 ЧАЛ.

ДУБРОВЕНСКІ РАЙКАЛГАССАЮЗ РАЗГАРНУЎ СТАЛІНСКІ ЗАКЛІК КАЛГАСЬНІКАЎ І НАКІРАВАЎ НА АСІНТОРФ ДАДАТКОВА 200 ЧАЛ. КАЛГАСЬНІКАЎ - АДЫХОДНІКАЎ.

Завод „Новая Беларусь“ дабіўся зруху

БРЫГАДА ВАСІЛЬЛЕВА ДАЕ 130-133 ПРОЦ. ДЗЕННАГА ЗАДАНЬНЯ

БАБРУЙСК, 8.

Торфазавод «НОВАЯ БЕЛАРУСЬ» ужо ў першыя дні жніўня дабіўся значнага перапому ў выкананьні пляну торфаздабычы.

Сэзоннае заданьне выканана на 60,9%. З кожным днём павялічваецца дзённая здабыча торфу. 5-га жніўня дзённае заданьне выканана на 99%, 6-га жніўня на 99,7%.

У выніку прапрацоўкі прамовы т. Сталіна і пастановы ЦК і СНК БССР аб торфараспрацоўках значна ўзьнялася хваля спаборніцтва і ўдарніцтва.

Брыгада т. ВАСІЛЬЛЕВА, якая ўвесь час адставала, зараз ПАКАЗВАЕ ЎЗОРЫ ЎДАРНАЙ РАБОТЫ, ВЫКОНВАЮЧЫ ДЗЕННАЕ ЗАДАНЬНЕ АД 130 ДА 133%.

Брыгада ПАЛЯВІКОВА дае 118-120% дзённага заданьня. Ад брыгады Паляўікова не адстаюць і брыгады ІВАНОВА, РЫГОРА І КАНДРАТА, якія таксама перавыконваюць дзённае заданьне.

Торфазавод адчувае недахват рабочай сілы. Бабруйскі райкалгассаюз, ведаючы аб гэтым, нязыкоснае дырэктыў партыі і ўраду аб пасылцы на торфараспрацоўкі калгасьнікаў.

Каб забясьпечыць выкананьне праграмы торфаздабычы рабочыя ўзьняпытаньне перад адміністрацыяй аб павялічэньні працоўнага дня і зараз працуюць па 10 гадзін у дзень.

По тэлеграфу з торфазаводаў

Зводкі з тарфянога фронту

БЫХАЎ. 6. (Патэлеграфу). Гута «Ільліч» забясьпечваецца апалам торфазаводам «Ленінскі шлях». На 1-га ліпеня замест 8.000 тон адпраўлена 7.478 тон.

У апошнія дні завод дасягнуў значных посьпехаў у выкананьні пляну торфаздабычы. На 4-га жніўня сэзоннае заданьне выканана на 77,0%. Здабыта 8.400,9 тон торфу. Процант дзённай здабычы павялічваецца. Калі за 2-га жніўня было здабыта 60 тон торфу, што склала 47,8% дзённага заданьня, дык за 3-га жніўня здабыта 100 тон торфу, або 79,8% дзённага заданьня.

Заводу патрэбна каля 100 чал. рабочых для таго, каб сапраўды ўдарным тэмпамі фарсаваць здабычу торфу. Быхаўскі райкалгассаюз на шматлікія прапановы заводу нічогане не зрабіў для выкананьня важнейшай задачы высунутай тав. Сталіным аб закліку на заводы калгасьнікаў-адыходнікаў.

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу) Завод «Чырвоны тарфянік» на 3-га жніўня сэзоннае заданьне па торфаздабычы выканаў на 78,2%. Дзённае заданьне 3-га жніўня выканана на 96,7%, —здабыта 100 тон.

Торфазавод «Чырвоны тарфянік» павінен быў адгрузіць для фабрыкі «Дзьвіна», мэтпрому, цагельнага заводу № 2 і іншых прадпрыемстваў Віцебску 8.231 тону торфу. На 1-га жніўня гэта заданьне завод выканаў цалкам.

СІРОЦІНА. 6. (Па тэлеграфу). Асноўным тормазам у работе торфазаводу імя Даўмана зьяўляецца недахват рабочай сілы.

Сіроцінскі РК КП(б)Б, райвыканком, райком камсамолу і райкалгассаюз нічога ня робяць для выкананьня пастановы завода нічога не зрабіў для цоўках, якая ставіць рашучу пытаньне аб 100% забесьпячэньні торфазавода рабсілай.

Уваччатая кампанія ў сувязі з прамовай т. Сталіна аб закліку ў вытворчасьць калгасьнікаў — праходзіць міма ўвагі сіроцінскіх райарганізацый.

Віцебская фабрыка «Дзьвіна» зьяўляецца асноўным спажыўцом торфу, які здабываецца заводам імя Даўмана, але партыйная арганізацыя фабрыкі, фабзаўком і іншыя арганізацыі ніякіх крокаў па дапамозе торфазаводу ў парадку рабочага шэфства ня ўжываюць.

ГОМЕЛЬ. 6. (Па тэлеграфу) На 4-га жніўня торфазавод «Закрашынскі мох» здабыў 8.517,3 тоны торфу, што складае 65,5% сэзоннага заданьня. Дзённае заданьне выканана на 118,9% — здабыта 195,3 тоны торфу.

Завод на 1-га жніўня выканаў вызначанае заданьне па адгрузцы торфу—апалу для фабрыкі «Дняпро» (Рэчыца). Шклобуду, заводу «Пралетарскі шлях» і фабрыкі «Чырвоны хэмік». Усяго адгружана 12.590 тон торфу.

Сэзонная здабыча торфу па БССР

ІДУЦЬ НАПЕРАДЗЕ:

«Чырвоны тарфянік»	— 78,2%
«Ленінскі шлях»	— 77,0%
«Закрашынскі мох»	— 65,5%
«Новая Беларусь»	— 60,9%
«Бальшавік»	— 54,3%

АДСТАЮЦЬ:

«Вольніца»	— 2,7%
«Смалявічы»	— 3,5%
«Рэмізава»	— 4,2%
«Чырвоная Беларусь»	— 4,4%
«Вялікі мох»	— 6,0%
«Калектыўная праца»	— 11,5%

БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ

У СТАНДАРТНЫМ—ПЕРАЛОМ

ВЫРАЗНАЙ РАБОТАЙ ПРЫМАЦАВАНЫХ ЛЕСАЗАВОДАЎ БУДУЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ ДАЛЕЙШЫЯ ПЕРАМОГІ ЦЭХА

За першыя 5 дзён жніўня цэх стандартных дамоў выпусьціў з мэханічнай апрацоўкі 17,5 дома, 1-га, 2-га і 3 жніўня цэх выпускаў па чатыры поўных камплекта дамоў, а 4-га жніўня па віне загадчыка базы сырцу, які не забясьпечыў патрэбнымі матар'ялямі, цэх прастаяў 4 гадзіны. Загадчык базы замест таго, каб даць адсартаваны лес 7-му заводу, які піліць дошкі выключна для стандартнага цэху, падаў нягодныя калоды, чым сарваў забесьпячэньне цэху.

Дасягнуты ў агуле пералом у работе стандартнага цэху тлумачыцца ўзьняцьцем працоўнай дысцыпліны, ліквідацыяй абязьлічкі, папаўненьнем рабочай сілай за лік калгасьнікаў адыходнікаў Парыцкага раёну.

На нарадзе загадчыкаў аддзелаў забесьпячэньня цэхаў і камбінату ўхвалена прымацаваць да стандартнага цэху яшчэ 4 рама-зьмены 6-га заводу. Гэта цалкам забясьпечыць цэх піламатар'ялямі.

Да гэтага часу дрэнна наладжана забесьпячэньне дамоў таганажам. (дошкі, якія ідуць без мэханічнай апрацоўкі). Прымацаваныя заводы «Спартак», «Рагачоў», «Халтурына» і «Градзянка» ня выконваюць нарадаў. З гэтай прычыны 112 дамоў для Данбасу ня могуць быць сабраны. 66 дамоў, якія да 10 жніўня будуць закончаны для Донугля, таксама ня могуць быць сабраны па віне вышэйпаказаных заводаў.

Цэх дабіўся пералому. Гэты пералом павінен быць замацаваны. Прымацаваныя заводы павінны бесьперабойна забясьпечваць цэх патрэбнымі матар'ялямі. Лесбел павінен прымусіць завод «Опартак» і «Халтурына» штодзённа адгружаць з вагонаў таганажу, а завод № 7 павінен акуратна забясьпечваць цэх піламатар'ялямі спэцыяльных разьмераў.

Н. Нэйдлін.

ДУШЫЦЕЛІ РАБОЧАГА ВЫНАХОДЗТВА

ПАВІННЫ ТРЫМАЦЬ АДКАЗ

Рад фактаў з практыкі рабочага вынаходзтва па Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце паказваюць, што мінулае кіраўніцтва камбінату, асобныя спэцыялісты, да апошняга часу фактычна ігнаравалі гэты вучастак работы. Вакол вынаходцаў ня была створана адпаведная абстаноўка, якая-б спрыяла дайлепшаму разгортванню вынаходзтва і рацыяналізацыі.

Вось некалькі больш характэрных фактаў, якія пацьвярджаюць абураючыя адносіны да вынаходзтва.

Яшчэ ў красавіку матарысты фанэрнага цэху т.Выгоцкі ўнёс прапанову аб пабудове электрамагнэсавых ножніц для рэзкі фанэры. Гэтыя ножніцы можна было бы арабіць у мэханічнай майстэрні камбінату. Праекты Выгоцкага былі ўхвалены інжынэрам Елісеевым, які даручыў мэханічнай майстэрні пабудаваць электра-магнэсавыя ножніцы. Але загадчык майстэрні Навіцкі замест дапамогі ў гэтай справе адказаў, што «усе майстры загружаны». Такі-ж адказ даваўся і пазьней. Выгоцкага часам выганялі з майстэрні, калі ён прыходзіў даведвацца аб магчымасьці пабудовы ножніц. Некаторыя проста абсьмейваліся з Выгоцкага, казалі, што калі ён хоча працаваць на камбінаце, дык няхай кіне сваё вынаходзтва. Цікавы дайшлі да таго, што тав. Выгоцкі быў прымушан кінуць фанэрны цэх і перайсьці ў другі. Але т. Выгоцкі ня кінуў свайго вынаходзтва. Ён самаўтужным спосабам, па працягу некалькіх тыдняў, пры дапамозе сваіх таварышоў зрабіў магнэсавыя ножніцы, у той час, калі ў майстэрні гэта працягвалася-б усяго 6-7 гадзін.

З такімі труднасьцямі прышлося ажыцьцяўляць вынаходзтва, якое дае эканоміі 25.000 рублёў у год. З вялікімі труднасьцямі прышлося змагацца за сваё вынаходзтва і майстру цэху стандартных дамоў т. Хамянку. Характэрна, што за яго вынаходзтва, якое дае 10-12 тыс. рублёў эканоміі ў год, ён не атрымаў ніякай прэміі.

Мэханік пільні № 7 — тав. Эдэльштэйн, даўно ўзьняў пытаньне перад інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам камбінату аб пабудове на пільні транспарцёру для транспартаваньня адкідаў з пад варштату, што дало-б эканоміі 17.000 руб. у год, але да гэтага часу ніякіх мер па прапанове тав. Эдэльштэйна ня прынята.

Наагул, трэба адзначыць, што справа дапамогі разгортваньню вынаходзтва на камбінаце стаіць надзвычай дрэнна.

Неабходна ў гэтай справе дабіцца рашучага пералому.

І. Скаварода.

У ЗАСЬЦЕНКАХ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Гераічная барацьба палітзьняволеных

супроць фашысцкага рэгляманту

Некалькі тыдняў назад у Вільні, у турме на Лукішках, скончылася цяжкая галадоўка палітзьняволеных. 190 палітзьняволеных арганізавана распачалі барацьбу і **галадалі на працягу 10 дзён.** Грамадзкая думка Савецкай Беларусі, мімаходам адзначыўшы гэты факт у прэсе, не зьвярнула на яго неабходнай, у даным выпадку, увагі і перашла да парадку дня. **Апошняя 10-дзённая галадоўка на Лукішках—гэта новы яркі факт масавага гвалту і крывавай расправы фашысцкай банды, згуртаванай у Віленскім судзе і пракуратуры, над дзьвума сотнямі рэвалюцыйных рабочых і сялян Заходняй Беларусі.**

Буржуазія і яе сацыял-фашысцкія памочнікі разам з беларускімі нацыянал-фашыстамі бязупынна крычаць аб нібы чырвоным тэроры, аб прасьледваньні пасельніцтва ў БССР і ва ўсім СССР. Яны якраз і цяпер узьнялі вакол гэтай галадоўкі брудную паклёпніцкую антысавецкую кампанію. Кангрэс сацыял-фашысцкага інтэрнацыяналу, які толькі што скончыўся ў Вене, шмат гаварыў аб становішчы палітзьняволеных у Польшчы. Але сацыял-паліцэйскі кангрэс над палітзьняволенымі разумее толькі «Брэсцкіх зьняволеных» — гэта значыць тых некалькі верных паслугачоў буржуазіі — ППС'-аўцаў ды вызваленцаў, якія пару тыдняў пасядзелі ў астрозе і якіх пан трохі сьцебануў па патыліцы, каб яны лепш працавалі. Гэтыя палітзьняволеныя для іх герыі. А 10 тысяч рэвалюцыйных рабочых і сялян у Польшчы, якія знаходзяцца за кратамі фашысцкіх турмаў — для іх ня існуюць. Гэта не палітзьняволеныя, бо яны асуджаны на 6, 8, 12 год, бо іх асуджаюць на сьмерць, бо іх па турмах катуюць, бо яны ўпарта, нязломна змагаюцца і за кратамі вастрогаў за вызваленьне працоўных мас з-пад улады капіталізму. Аб гэтых героях інтэрнацыянал сацыял-фашыстаў гаварыць ня будзе.

Гэтыя паны добра ведаюць зладзейскі звычай. У той час, калі трэба адвярнуць ад сабе ўвагу, яны крычаць «лаві злодзея».

Не. Ні адвярнуць увагі, ні замесьці сьлядоў вам ня ўдасца.

Аб тым, што адбылося на Лукішках павінна ведаць уся рабоча-сялянская Савецкая Беларусь.

У пачатку ліпеня віленская фашысцкая пракуратура і турэмная адміністрацыя вастрогу на Лукішках увялі ў жыцьцё фашысцкі турэмны рэгламант, хацелі адабраць у палітзьняволеных рэшткі тых правоў, якія не палетрапілі адабраць перад гэтым. У палітзьняволеных была адабрана: бібліятэка, больш як 1000 кніг, права па атрыманьне газэт і харчовых пасылак з волі, пісьмовыя прылады з камэр, уведзена прымусовае нашэньне турэмнай вопраткі, скасавана харчавая камуна, зьменшана прагулка да паўгадзіны ў дзень, пакарана карцэрам дэлегатка жанчын **Алена Лябецкая**, трымалі ў астрозе сьмяротна хворага **Міцьку. Адабраньне гэтых правоў фактычна азначала скасаваньне катэгорыі палітзьняволеных і зраўнаньне іх з крымінальнымі і нават стварэньне для іх горшых умоў.** У гэтых умовах палітзьняволеныя былі асуджаны на паступовае фізычнае і духоўнае вымураньне.

Ніякі рэвалюцыянэр ня мог згадзіцца на гэткія ўмовы. У руках палітзьняволеных астаўся адзін сродак абароны і барацьбы—**гэта галадоўка.** Галадоўка не для таго, каб выклікаць літасьць у лютага ворага Не. Люты вораг — фашысцкая дыктатура — ня мае літасьці да рабочых і сялян, яны яе і не напрабуюць. **Толькі барацьбой, толькі сілай вырашаецца тут справа.**

4-га ліпеня 190 палітзьняволеных абвясьцілі галадоўку і патрабавалі скасаваньня ўсіх новаўведзеных парадкаў і апрача гэтага:

1. Прызнаньня прадстаўніка палітзьняволеных у перагаворах з турэмнай адміністрацыяй.

2. Вольнай прагулкі.

3. Пераводу ў агульныя камэры.

4. Спыненьне біцьця палітычных зьняволеных і саджаньня іх па карцэрах і інш.

Банда фашысцкіх забойцаў, каб моўчкі лепш расправіцца са зьняволенымі барацьбітамі, хацела ўтаіць факт галадоўкі перад рабочымі і беспрацоўнымі Вільні. Ужо ў той час, калі галадоўка пачалася і да рабочых пачалі даходзіць весткі аб ёй, пракуратура падала ў друку афіцыяльнае абвяржэньне, што ніякай галадоўкі няма, зьняволеным жывецца «як ў раі», а таго, хто пісаў аб галадоўцы і беспрацоўным Вільні добра ўжо ведаддаць пад суд. Рэвалюцыйныя рабочыя ноць цану пракурорскай брахні. Яны не пакінулі сваіх таварышоў адных у іх барацьбе супроць фашысцкага турэмнага рэгляманту і салідарна сталі на барацьбу ў іх абарону. У Вільні ў розных пунктах гораду, ля памяшканьня суду, ля турмы і кала ваяводзтва адбыліся баявыя дэманстрацыі беспрацоўных рабочых, у часе якіх даходзіла да сутычак з паліцыяй, як гэта мела месца 7-га ліпеня каля ваяводзтва. Апрача гэтага па фабрыках і варштатах адбыліся забастоўкі пратэсту. На гуце Шапіра і фабрыцы Навагрудзкага адбыліся 2-х гадзінныя пратэстацыйныя забастоўкі.. Наогул кампаніяй пратэсту было ахоплена больш 750 віленскіх рабочых.

Паліцыя жорстка расправілася з дэманстрантамі, але яшчэ горш з галадаючымі зьняволенымі. У ход былі пушчаны ўсе сродкі вядомыя віленскім катам, каб толькі зламаць барацьбу галадуючых. Калі на пяты дзень галадоўка ня спынілася, **турэмная адміністрацыя пры дапамозе паліцыі хадзіла па камэрах і катавала зьняволеных, закоўвала ў кайданы па руках і нагах, садзіла ў цёмныя карцары, ужывала штучнае кармленьне.** Але нічога не магло зламаць герояў-барацьбітоў. Галадоўка ішла. Упартая барацьба галадаючых, іх нязломная воля да перамогі, націск рэвалюцыйных рабочых з другога боку турмы, прымусіла фашысцкіх катаў пайсьці на ўступкі. На 10-ты дзень галадоўкі, ня будучы ў стане зламаць галадаючых, турэмная адміністрацыя дакляравала даць вольную прагулку, харчовы калектыў і пісьмовыя прылады ў камэры і інш.

Як толькі палітзьняволеныя галадоўку спынілі, на другі-жа дзень быў уведзен новы катаржны рэгламант, горшы за папярэдні.

Зьнясіленыя, змучаныя 10-цідзённай галадоўкай палітзьняволеныя не змагалі адразу распачаць барацьбы. Рэгламант быў уведзены. **У выніку галадоўкі 16 асоб цяжка хворых ляжаць у турэмным шпіталі. Шмат палітзьняволеных былі вывезены ў Вронкаўскі цэнтрал** у Познані. Палітычная **Хася Цэйтэль** ляжыць спаралізаваная.

Вось крывавыя падзеі ліпнёвых дзён на Лукішках. Лукішкі сталі сымбалем катаржных умоў, крывавага тэрору, цяжкіх галадовак і ўпартай барацьбы. Лукішкі ўжо маюць за сабою крывавую гісторыю галадовак. Вось яна. **Май 1926 г., сьнежань 1926 г., сакавік 1928 г., верасень 1929 г., сьнежань 1930 г. і ліпень 1931 г.** Вось крывавыя этапы і даты, якіх не забудуць рабочыя і сяляне Зах. Беларусі, якія памятаем і мы. А хто забудзе — прыпомнім.

Лукішкі—гэта ня выпадак, Лукішкі гэта толькі адно зьвяно ў ланцугу фашысцкага тэрору. Узмацняючы капіталістычную эксплёатацыю, нацыянальны ўціск і белы тэрор, расстрэльваючы і атручваючы газамі дэманстрацыі рабочых і сялян, фашысцкі ўрад гвалтоўна пагаршае ўмовы быту палітзьняволеных ва ўсёй Польшчы. Усюды ўводзіцца фашысцкі турэмны рэгламант. Ва ўсёй Польшчы як і на Зах. Беларусі, па ўсіх вастрогах 10 тыс. палітзьняволеных вядуць супроць гэтага рэгламанту ўпартую барацьбу. Гэта барацьба знаходзіць магутнае падтрыманьне з боку ўсіх рабочых і сялян. У гэтым падтрыманьні яе сіла. Барацьба палітзьняволеных супроць турэмнага фашысцкага закону ёсьць частка рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры на вузкім турэмным вучастку агульна-рэвалюцыйнага фронту. Супольнымі сіламі рабочых і сялян і ўпартай барацьбой палітзьняволеных турэмны фашысцкі закон павінен быць зламаны і ён будзе зламаны. **Лукішкі клічуць на дапамогу.** Будзем-жа ўважліва сачыць за падзеямі ў фашысцкай Польшчы. Дружна і арганізавана станем на абарону палітзьняволеных у Зах. Беларусі і ва ўсёй Польшчы. Няхайжа і нашым лёзунгам у гэтай барацьбе будзе: «Прэч фашысцкі турэмны закон!». «Вызваліць 10 тыс. палітзьняволеных!».

П. Крэвіч.

ПАЗЫКА „ІІІ РАШАЮЧЫ“

У дэкаду індустрыялізацыі максымальна ўзмацніць рэалізацыю пазыкі на вёсцы

З аваюем пералом у аднаасобным сэктары—самым адсталым вучастку кампаніі

Поўнасьцю і сваячасова ўнесьці першы ўзнос па пазыцы

15-га жніўня — тэрмін паступленьня у касы Дзяржбанку першага ўзносу па калектыўнай падпісцы рабочых і служачых на пазыку «Тр

Год выданьня—XV
№ 214 (4119)
НЯДЗЕЛЯ, 9 ЖНІЎНЯ 1931 г.
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсакратар—13-90, прамысл.—13-60, сан. зяма.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-47, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторавыя—8-1, адказ. абанемент—7-81

СЁНЬНЯ—

дзень Чырвонага плебісцыту ў Прусіі

Сёньня працоўныя масы вынясуць свой прыгавар ураду надзвычайных дэкрэтаў, грабяжу працоўных мас

Пад кіраўніцтвам кампартыі рэвалюцыйны пралетарскі фронт пераходзіць у наступленьне

Адозва ЦК нямецкай кампартыі

БЭРЛІН, 7. ЦК нямецкай кампартыі выпусьціў новую адозву з поваду маючага адбыцца 9-га жніўня ўсенароднага галасаваньня. У адозве гаворыцца:

«Чырвонае ўсенароднае галасаваньне 9-га жніўня будзе днём барацьбы супроць сыстэмы Брунінга-Брауна-Зэвэрынга і супроць фашызму. Урады Брунінга-Брауна-Зэвэрынга — самая моцная і надзейная апора рэжыму надзвычайных дэкрэтаў і прыгнечаньня працоўных. Капіталісты, урад, фашызм і сацыял-фашысцкія прыслужнікі — віноўнікі няшчасьцяў мас. БЯЗ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ІХ СЫСТЭМЫ, — НЯ МОЖА БЫЦЬ ХЛЕБА ДЛЯ ГАЛОДНЫХ. Хто за захаваньне сыстэмы Брунінга-Брауна-Зэвэрынга — той дапамагае капіталістам і дае грабежніцкаму і фінансаваму капіталу магчымасьць перамагчы банкрутства капіталізму шляхам узмацненьня галечы і цярпеньня працоўных. Хто за ўрад Брауна-Зэвэрынга — той абараняе сыстэму надзвычайных дэкрэтаў, падаткаў на працоўныя масы, мытаў бязупынкага абагачэньня капіталістаў, грабяжу зарплаты і голаду многіх мільёнаў.

Кампартыя Нямеччыны заклікае ўсіх працоўных гораду і вёскі: змагайцеся супроць гэтай сыстэмы. Прымайце ўдзел у чырвоным усенародным галасаваньні! Галасуйце ўсе ў нядзелю за роспуск прускага ландтагу»!

Ужо зараз працоўныя ў барацьбе супроць фашызму дабіліся вялікіх посьпехаў. Пастанова ЦК кампартыі заклікаць працоўных да чырвонага ўсенароднага галасаваньня прывяла да РАСТРОЙСТВА, РАСПАДУ І ПАСЛАБЛЕНЬНЯ ФАШЫСЦКАГА ФРОНТУ. Многія працоўныя, якія яшчэ ўчора верылі ілжывым дэмагагічным фразам і манэўрам фашыстаў — Гугенбэрга, Гітлера і Зэльдтэ, — цяпер у рэзультаце таго, што разгарнуўся народны рух чырвонае ўсенароднае галасаваньне супроць Брауна і Зэвэрынга, сталі ў рады клясавага фронту пралетарыяту.

Яшчэ больш значныя посьпехі, дасягнутыя сярод сацыял-дэмакратычных рабочых і моладзі. РЭВАЛЮЦЫЙНЫ АДЗІНЫ ПРАЛЕТАРСКІ ФРОНТ ПЕРАХОДЗІЦЬ У НАСТУПЛЕНЬНЕ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМПАРТЫІ. НІШТО НЯ МОЖА СПЫНІЦЬ ЯГО НАСТУПЛЕНЬНЕ. Яно павінна быць яшчэ больш імклівым і сьмелым, каб разьбіць усіх ворагаў працоўных.

Няхай жыве барацьба за Чырвоную Прусію «у рамках свабоднай сацыялістычнай Нямеччыны!»

Крытычныя мінуты ўраду Брунінга

БЭРЛІН, 7. Адозва прускага ўраду супроць усенароднага галамаваньня не аказала пажаданага дзеяньня, а наадварот, толькі пагоршыла палітычнае становішча прускага ўраду. Сацыял-дэмакратычны прускі ўрад ужывае мэтады, да якіх зьвярталася камандваньне армій у часе сусьветнай вайны і цяпер зьвяртаюцца фашысцкія ўрады, якія яшчэ больш выкрылі перад шырокімі пластамі працоўных рэакцыйны характар прускага ўраду.

З другога боку ўзмацняецца незадавальненьне прускім урадам у правых колах. Увесь правы друк абураны тым, што яму прышлося надрукаваць адозву прускага ўраду. Правыя газэты абураюцца з поваду спробы адозвы зваліць у адну кучу правыя партыі і камуністаў, якія змагаюцца за Савецкую Прусію. На працягу дня Гіндэнбург атрымаў ад правых шматлікія тэлеграмы, якія пратэстуюць супроць неправільнага застасаваньня надзвычайнага дэкрэту. Гіндэнбург у сувязі з гэтым, выдаў загад, перагледзець надзвычайны дэкрэт аб друку. Зьмены дэкрэту, якія маюць адбыцца, яўна вядуць да таго, што ён будзе яшчэ ў большай ступені накіраваны супроць рэвалюцыйнага рабочага друку, будзе зьмяшчаць паслабленьне ў адносінах да друку правых партый. (ТАСС).

Забастовачная хваля пашыраецца

Рабочыя кляймяць здрадніцтва сацыял-фашыстаў

ВАРШАВА, 8.

Забастоўка лодзінскіх камунальнікаў за апошнія два дні значна абвастрылася. Кіраўніцтва забастовачнай барацьбой знаходзіцца ў руках рэвалюцыйных рабочых.

5 жніўня адбыўся вялізарны мітынг бастуючых рабочых, на якім прысутнічала каля 2.000 чалавек. Мітынг выліўся ў бурную дэманстрацыю супроць сацыял-фашыстаў, якія ўжо ня раз здрадніцкі прадавалі забастоўкі лодзінскіх рабочых. Мітынг аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю, у якой патрабуе адстаўкі лодзінскага магістрату, у якім верхаводзяць сацыял-фашысты з ППС. Пасьля мітынгу рабочыя з'арганізавалі бурную вулічную дэманстрацыю. Для яе разгону былі выкліканы паліцэйскія атрады. Паміж дэманстрантамі і паліцыяй адбыліся жорсткія сутычкі. Некалькі чалавек паранена.

У Гарадзеншчыне ў Чорнайвесі распачалася забастоўка тартачнікаў супроць жорсткага наступленьня, якое праводзяць уласьнікі тартакоў. За апошнія часы ненасытныя прадпрыемцы пад пагрозай звальненьня прымушаюць рабочых працаваць па 16 гадзін у дзень, зьніжаючы пры гэтым значна зарплату.

Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік», Верхня-Сілезкае прамысловае таварыства значна зьнізіла зарплату рабочым. Рабочыя адмовіліся прыняць гэта зьніжэньне. У адказ, прадпрыемцы звольнілі ўсіх рабочых і служачых.

Па ўсёй Верхняй Сілезіі ў мэталюргічнай чыгуна-ліцейнай прамысловасьці адбываюцца масавыя рэдукцыі. Акцыйнае таварыства «Заверце» выкінула па вуліцу звыш 1.900 рабочых.

Апошнімі днямі ў Кракаве адбываюцца бурныя выступленьні беспрацоўных. На вялікіх мітынгах, якія заканчваюцца вулічнымі дэманстрацыямі, беспрацоўныя патрабуюць ад фашысцкіх улад хлеба і працы. Значныя хваляваньні беспрацоўных адбыліся ў Валаміне пад Варшавай; выкліканая паліцыя жорстка расправілася з дэмэнстрантамі.

149 самагубстваў у аднэй толькі Варшаве за месяц

«Гэртруда Гарабурда», 21 год, ужо доўгі час знаходзілася без працы. Вычарпаліся ўсе сродкі. Даўно не плаціла кватэрнае платы. Была ўпэўнена, што няма ўжо выхаду. Пазычыла ад некага са знаёмых адну залатоўку, быццам на вячэру, але купіла бутэлечку воцтавай эсэнцыі; пашла потым на вуліцу Вспульную, дзе выпіла воцат.

Памерла ў больніцы».

***

Раман Мізік, 42., займаўся гандлем стар'я, меў жонку і двое дзяцей. Ня мог пракарміць сям'і і заплаціць кватэрнай платы. Уначы выпіў бутэлечку воцтавай эсэнцыі, не дазволіў сябе ратаваць санітарам хуткай дапамогі. Памёр у больніцы.

68-гадовы С. Дамброўскі, беспрацоўны імкнуўся пакончыць самагубствам; перарэзаў жылы на нагах.

На Брудноўскіх могілках два разы стрэліў у сябе беспрацоўныЕндрасяк.

27-гадовая Н. Мразоўска, беспрацоўная работніца атруцілася з прычыны адсутнасьці працы.

21-гадовая І. Бэднарска, страціўшы працу, пакончыла самагубствам

18-гадовая т. Кіш, беспрацоўны, пакончыў самагубствам.

Гэта толькі частка таго жудаснага пераліку, які падае сацыял-фашысцкі «Роботнік» на працягу аднаго толькі дня. Усяго-ж паводле вестак таго-ж сацыял-фашысцкага «Роботніка» у аднэй толькі Варшаве за ліпень пакончыла самагубствам 149 асоб.

16 капеек за 16 гадзін працы

Страшэнная галеча сярод саматужнікаў у Польшчы

ВАРШАВА, 8. У Зэлёва, як паведамляе фашысцкая «Газэта Варшавска», выбухнула забастоўка ў тэкстыльнай фабрыкі Ерсака. Бастуе 129 рабочых. Прычына забастоўкі — сыстэматычнае абрэзваньне заработнай платы, якое праводзяць капіталісты. Адначасова з гэтым забаставала звыш 2.000 саматужнікаў-ткачоў, якія бязьлітасна эксплёатуюцца фабрыкантамі.

Сярод гэтых саматужнікаў панує страшэнная, нідзе нябачаная галеча, масава пашыраюцца хваробы. Звыш 60 проц. гэтых няшчасных людзей хварэюць на сухоты. Сотні сем'яў выміраюць на вачох усіх. Нават «Газэта Варшавска», якая наогул адзначаецца нянавісьцю, да рабочае клясы, піша наступнае аб жахлівым становішчы гэтых саматужнікаў:

«Як даносіць Лодзінскі друк, гэтыя ткачы забаставалі з прычыны пастаянных зьніжэньняў зарплаты, якая ўжо дайшла да 5 грошай за гадзіну (на нашы грошы і капейка) і выплачваньні ім зарплаты вэксэлямі і бонамі, якіх ніхто ня выменьвае на грошы.

Маем, значыцца, у Польшчы рабочых, якія нізкім узроўнем зарплаты могуць канкураваць з кітайскімі кулі. А трэба дадаць, што гэты ээлёўскі ткач, які атрымлівае 5 грошай за гадзіну працы, зусім не карыстаецца з больнічнай касы, фондам беспрацоўя, мае ўласную машыну і сам павінен пакрываць усе выдаткі на памяшканьне, сьвятло і г. д.

Таямніцай існаваньня людзей, якія атрымліваюць такую нізкую зарплату, зьяўляецца праца па 12-16 гадзін у дзень пры дапамозе жанчын і малалетніх дзяцей».

„Спэкулянты, якія ў СССР лічацца ворагамі, тут выбіраюцца ў парлямант"

Даклад Бэрнарда Шоу аб паездцы ў СССР перад студэнтамі

ЛЮНДАН. Бэрнард Шоу зачытаў даклад аб сваёй паездцы ў СССР перад студэнтамі летняй школы незалежнай рабочай партыі ў Вельвіне.

Шоу пачаў з таго, што назваў савецкую сыстэму «ўзорам для ангельскіх сацыялістаў». «Абавязак усіх тых блудзячых у цемры людзей, якія прапаведуюць сацыялізм у дзікіх дзебрах Англіі, — сказаў Шоу, — паехаць у СССР і паглядзець, як будуецца сацыялізм. У СССР няма парляманту ці якой-небудзь недарэчнасьці ў тым-жа родзе. У Англіі парляманту патрэбна 30 год, каб зрабіць справу, якая патрабуе ў сапраўднасьці паўгадзіны. Спэкулянты, якія ў СССР лічацца ворагамі, тут выбіраюцца ў парлямант. Пры савецкай сыстэме, калі трэба зрабіць якую-небудзь справу, гэта ажыцьцяўляецца тымі, хто адказвае за належнае выкананьне. Для кожнага адзіны спосаб апраўдаць сваё існаваньне, гэта — зрабіць належным чынам сваю работу. У адваротным выпадку яго чакае падобнае з вяршыны на самае дно. Тое, што мы завем дэмакратыяй, разбурае падобную адказнасьць замест таго, каб ствараць яе. У нас ні адзін з палітычных дзеячоў не ўладае сапраўдным пачуцьцем адказнасьці. Пры савецкай сыстэме няма чаго баяцца таго, што адбываецца ў нас, — няма чаго баяцца, што людзі атрымаюць назначэньне толькі таму, што яны зьяўляюцца сынамі лёрдаў».

Характарызуючы нядольнасьць буржуазнай дэмакратыі справіцца з любой больш ці менш новай задачай, Шоу прыпомніў, што лёрд Лоціен, які разам з ім езьдзіў у СССР, прапанаваў ураду Макдональда нацыяналізаваць частку яго зямельных уладаньняў для грамадзка-палітычных мэт. «Але нават наш сацыялістычны ўрад ва ўмовах дэмакратычнага ладу прызнаў, што ня мае неабходнага для гэтага апарату».

Далей Шоу падкрэсьліў, што спробы капіталізму браць прыклад з савецкай сыстэмы і арганізаваць гаспадарку па плянавым мэтадзе засуджаны на крушэньне раней усяго таму, што савецкі рабочы зусім інакш адносіцца да сваёй справы, чым рабочыя буржуазных краін. У СССР рабочым гавораць: запражэцеся ў работу, цярпеце недахваты, абыходзьцеся бяз лішкаў, працуйце пяць год і тады будзе рэзультат. У Англіі рабочы адказаў-бы на такія словы: з якой радасьці буду я цярпець недахваты ці працаваць больш упарта, чым цяпер, для таго, каб багатыя сталі яшчэ багацей, а бязьдзельнікі атрымалі яшчэ больш часу для бязьдзельня, тады як я стану бядней, чым калі-небудзь. У рэзультаце пры капіталістычнай сыстэме англійскія рабочыя стараюцца працаваць як мага менш, атрымліваючы за гэта як мага больш».

«Нічога дзіўнага, — гаварыў далей Шоу, — калі СССР праграсуе шпаркімі скачкамі. Там людзі вызваліліся ад паразытаў, якія тут, ня гледзячы на цяжкі для прамысловасьці пэрыяд, працягваюць выцягваць ня менш прыбыткаў, чым калі-небудзь. Савецкая машына працуе на змазаных падшыпніках, а ў нашай сыстэме ў падшыпніках — пясок. Савецкая сыстэма ёсьць тое, да чаго мы павінны будзем прысьці».

«Рускім вельмі трудна паверыць, — сказаў далей Шоу, — што мы так надзвычай глупыя, як гэта ёсьць у сапраўднасьці. Нават Сталін часта гаварыў: «Усякі інтэлігентны чалавек можа бачыць вось тое і гэта». Яму ня верылася, што тут людзі не разумеюць сутнасьці камунізму. Савецкія правадыры перавышаюць дзяржаўных дзеячоў капіталізму ня толькі тым, што яны стаяць далей Шоу, — што мы так наяць на маральна больш высокай пазыцыі камунізму; інтэлектуальна яны таксама вышэй іх. Калі іх сыстэма — вогненнае вяшчаваньне, то наша сыстэма штурхае нас у бяздоньне».

Закранаючы далей пытаньне аб шкодзе імпэрыялістычнай вайны, Шоу сказаў: «Трэба зразумець, што ў СССР сапраўды баяцца небясьпекі імпэрыялістычнай вайны. Людзі ведаюць там, што Чэрчыль кінуў ангельскія войскі на інтэрвэнцыю, але яны ня ведаюць, што гэта інтэрвэнцыя была ажыцьцёўлена бяз згоды парляманту. Я казаў ім, што масы ў Англіі ня хочуць вайны з СССР, але яны напаміналі, як ангельскі ўрад, дзейнічаючы падобна глупым школьнікам, якія забаўляюцца ў разбойнікаў, зрабіў налёт на Аркос: ангельскія масы былі, як відаць, ня ў стане кантраляваць урад ці перашкодзіць яму весьці вайну; нават лебарысцкія колы холадна гаварылі аб савецкай краіне. Я сказаў Сталіну, што ня лічу небясьпеку вайны сур'ёзнай, але як сумленны чалавек я палічыў сваім абавязкам даць яму ў той-жа час «кромвэлеўскую параду — спадзявацца на госпада, але трымаць порах сухім».

Адказваючы потым на пытаньні слухачоў, Шоу адмаўляў існаваньне тэрору ў СССР, заяўляючы, што ён існуе толькі для спэкулянтаў, сабатажнікаў і г. д., «Справа «Прампартыі», — сказаў Шоу, — з бясспрэчнасьцю паказала, што рашткі капіталістычных элемэнтаў займаюцца сабатажам. Можа быць, дзіўна расстрэльваць такіх людзей, але гэта неабходна. Але расстрэл — не адзіны мэтад адносін савецкай улады з такімі людзьмі. Рад інжынэраў былі пасланы назад для работы на прадпрыемствы, і яны шчыра пастараліся зьмяніць сваю псыхалёгію».

У заключэньне Шоу сказаў, што калі «ня будзе зроблена што-небудзь», то ангельскі капіталізм нямінуча разваліцца. «Савецкая сыстэма» — паўтараў Шоу, — ёсьць тое, да чаго мы павінны будзем прысьці, калі мы хочам сацыялізму».

Лебарысцкі орган «Дэйлі геральд» прысьвячае заявам Шоу вялікую перадавіцу, у якой рэзка крытыкуе яго за «адмову ад дэмакратыі ў карысьць дыктатуры». Газэта заяўляе таксама, што Шоу быў «заваёваны» савецкімі дзеячамі «пасьля дзевяцідзённага падарожжа». Пераход Шоу на бок пралетарскай дыктатуры «Дэйлі геральд» прабуе вытлумачыць яго «любоўю да драматычнага».

(«Известия»)

ГАРОДНІНУ—РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

Злачынная безгаспадарчасьць на складах МЦРК і Белкаапсаюзу

Дзесяткі вагонаў бульбы і іншай гародніны гніюць

НА СКЛАДАХ БЕЛКААПСАЮЗУ І МЦРК ПАНУЕ АГІДНАЯ БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ. СОТНІ МЯШКОЎ БУЛЬБЫ І ГУРКОЎ ГНІЮЦЬ ПАД ПАВЕЦЬЦЮ. 8 ВАГОНАЎ КАПУСТЫ ПСУЕЦЦА ПА ЗАСЕКАХ.

КАЛЯ 15 ВАГОНАЎ РАНЬНЯЙ БУЛЬБЫ ЛЯЖЫЦЬ УЖО ДВА ТЫДНІ, НЕ ПАСТУПАЕ Ў КРАМЫ І ПАЧЫНАЕ ПСАВАЦЦА. 600 КІЛГ. РАДЫСКІ ПАРАСЛО Ў ДВУХ ЗАСЕКАХ. ПАГНІЛА ЗУСІМ РАНЬНЯЯ ЦЫБУЛЯ.

УСЯ ГЭТА ГНІЛЬ ЗРАБІЛА ЗАСЕКІ НЯПРЫГОДНЫМІ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА ХАВАНЬНЯ ГАРОДНІНЫ.

СКЛАД БЕЛКААПСАЮЗУ ЗУСІМ ВІЛЬГОТНЫ І НЕ ПРАСУШВАЕЦЦА. НА ПАДВОЗЕ ВАЛЯЕЦЦА КУЧА ГНІЛЫХ ГУРКОЎ І РАСКІДАНЫ МОКРЫЯ МЯШКІ.

ТРЭБА ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ АБУРАЮЧАЙ БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦІ. НЕАБХОДНА ТЭРМІНОВА РАЗГРУЗІЦЬ СКЛАДЫ АД ЗАЛЕЖАЎ ГАРОДНІНЫ І НЕДАПУСКАЦЬ ГЭТЫХ ЗАЛЕЖАЎ НАДАЛЕЙ. ТОЛЬКІ ТАДЫ РАБОЧЫ-СПАЖЫВЕЦ БУДЗЕ СВАЯЧАСОВА АТРЫМЛІВАЦЬ СЬВЕЖУЮ І ДОБРАЯКАСНУЮ ГАРОДНІНУ.

ПРАКУРАТУРА ПАВІННА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ ГАЛАВАЦЯПАЎ, ЯКІЯ ДАПУСЬЦІЛІ ПСАВАНЬНЕ ГАРОДНІНЫ, У ТОЙ ЧАС, КАЛІ АПОШНЯЙ У КРАМАХ НЕ ХАПАЕ.

Н.

Завоз гародніны ў Менск

М. Н. Б.

ГУРКІ
Заданьне — 2.000 клгр. у дзень.
Паступіла — 28.977 клгр.

БУРАКІ
Заданьне — 5.000 клгр. у дзень.
Паступіла — 3.572 клгр.

ПАМІДОРЫ
Паступіла 155 клгр.

ЯБЛЫКІ І ГРУШЫ
Паступіла 2.771 клгр.

На Гомельскай і Віцебскай прыстанях

Фонды прэміяваньня ўдарнікаў ВАЛЯЮЦЦА НА СКЛАДАХ

Да адказнасьці вінаватых!

Рэчны транспарт усе фонды для прэміяваньня лепшых ударнікаў, як і будаўнічыя матар'ялы, і г. д. атрымліваў ў цэнтралізаваным парадку. Здавалася-б, што гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі рэчнага транспарту павінны ўжыць усе захады, каб гэтыя фонды не замарожвацца на складах і без затрыманьня правільна іх скарыстоўваць па прызначэньні.

Але на справе мы маем такое становішча, што на большасьці прыстаней, суднабудаўнічых майстэрнях і ТСТ гэтыя фонды замарожваюцца, а некаторыя востра-дэфіцытныя тавары цэлымі гурамі не прасоўваюцца да спажыўца, да месца будаўніцтва, і, такім чынам, штучна ствараюцца «аб'ектыўныя» труднасьці.

Барацьба за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў і правільнае іх выкарыстаньне, як на прыстанях, так і па суднах праводзіцца зусім невыстарчальна і надзвычай чарапашымі тэмпамі.

У большасьці вузлавых раёнаў рэчнага транспарту ў пытаньні мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, прэміяваньня лепшых ударнікаў і г. д. існуе поўная абязьлічка і безгаспадарчасьць.

Каштоўныя дэфіцытныя тавары і гатовая прадукцыя доўгі час валяюцца на складах прыстаней і суднабудаўнічых майстэрань у той час, як яны маглі-б быць хутка рэалізаваны. Так, напрыклад, у Новабеліцкіх суднарамонтных майстэрнях ляжаць нерэалізаванымі гатовыя вырабы на суму 7.256 руб. з 1 студзеня 1931 г.

На складах Гомельскай прыстані валяюцца петлі бляшаныя ў колькасьці 13 тыс. штук, шурупы з круглымі галоўкамі — 40 грос, алебастр — 25 мяшкоў, палітура сьпіртавая — 300 кгр., чорны сьпіртавы лак — 400 кгр., цэмэнту 2 вагоны, пасы зьвеньнявыя — 90 мэтраў, гума з 4-міліметровая — 80 кгр., паўнадлеск для ботаў — 150 пар і хромавых ботаў — 19 пар і г. д.

Ня лепш стаіць справа са скарыстаньнем прэміяльнага фонду для лепшых ударнікаў. На працягу доўгага часу ляжаць прэміяльныя фонды, а начальнікі прыстаней і прафарганізацыі і ў вус ня дуюць. Так, напрыклад, на Віцебскай доўгі час ляжаць нерэалізаванымі 5 скрынь літаратуры, прызначанай для прэміяваньня. На Гомельскай прыстані на складзе валяюцца тавары, прызначаныя і для прэміяваньня лепшых ударнікаў у наступнай колькасьці: сапіну — 79 мэтраў, чорнай тканіны — 43 мэтры, 3 гарнітуры, 3 пары штанаў суконных, 3 суконныя рубахі, абутак і г. д.

Такое-ж становішча мы маем не толькі па Гомелі і Віцебску, але і ў іншых пунктах рэчнага транспарту.

На складзе Гомельскай прыстані ёсьць шмат спэцвопраткі, прызначанай для грузчыкаў, але чамусьці гэтую вопратку начальнік прыстані не выдае рабочым, а з гэтай прычыны ёсьць цякучасьць рабочай сілы.

У часе правядзеньня месячніка аўралу па ліквідацыі прарыву на рэчным транспарце, брыгада выявіла, што на складах гомельскай прыстані для спэцвопраткі ляжыць 80 штук куртаноў для грузчыкаў, 300 штук насыпак і наўлечак для падушак, 55 байкавых коўдраў, 34 суконныя коўдры, 28 пасьцілак і г. д. — усе гэтыя тавары ляжаць доўгі час.

Органам РСІ трэба тэрмінова прымусіць гаспадарнікаў рэчнага транспарту не замарожваць тавараў, якія павінны быць без затрыманьня рэалізаваны на прызначэньні.

У прыватнасьці неабходна зараз-жа рэалізаваць прэміяльныя фонды сярод лепшых ударнікаў рэчнага транспарту.

Прыцягнуць масы воднікаў

да правядзеньня кампаніі пераходу на гаспадарчы разрахунак

СНК БССР пастановай ад 3 жніўня 1931 г. па справаздачы начальніка Дняпра-Дзьвінскага кіраўніцтва, абавязаў апошняга ў дэкадны тэрмін скончыць пераход на гаспадарчы разрахунак усе паравыя адзінкі рэчнага транспарту. Таксама СНК абавязаў Днепра-Дзьвінскае кіраўніцтва да 1 верасьня б. г. скончыць прапрацоўку пытаньня пераводу на гаспадарчы разрахунак прыстаней 1-га і 2-га разраду, судна-рамонтных і судна-будаўнічых майстэрань, арцеляй грузчыкаў і г. д.

Гэта пастанова СНК аб фарсаваньні пераводу ўсіх зьвеньняў рэчнага транспарту на гаспадарчы разрахунак, зьвяцца магутным сродкам у выкананьні вымяральнікаў трансфінпляну асеньняга навігацыйнага пэрыяду, паслужыць далейшым стымулам для ўзьнаўленьня працыйнасьці працы, правільнага скарыстаньня тэхнічных магчымасьцяй рэчнага транспарту і г. д.

Днепра-Дзьвінскае кіраўніцтва распрацавала канкрэтныя месячныя і квартальныя трансфінпляны для кожнай адзінкі рэчнага транспарту, якая пераводзіцца на гаспадарчы разрахунак. На месцы паспаны адказныя працаўнікі транспарту з мэтай даведзеньня гэтых трансфінпляноў да кожнага судна, каманды, заключэньня на аснове гаспадарчага разрахунку дагавораў і г. д.

Неабходна зьвярнуць увагу Днепра-Дзьвінскага кіраўніцтва і райкамводу БССР на адну «дробязь», ад якой будзе залежыць у значнай ступені сапраўдны, а не папяровы пераход рэчнага транспарту на гаспадарчы разрахунак— гэта работа рахункова апарату, упіконваяй справаздачнасьць пасасобных суднаў, прыстаней і г. д.

Зводка выкананьня навігацыйнага пляну па Днепра-Дзьвінскім басэйне на 1 жніўня 1931 г.

Асноўныя вымяральнікі	Выкананьне пляну навігац.
1. Пасажыры	41,5
2. Грузы вялікай хуткасьці	32,0
3. Грузы малой хуткасьці	41,3
4. Выкарыстаньне навігац. часу	42,5

Трэба будзе ў тэрміновым парадку ўвесьці штодзенны ўлік выкананьня вымяральнікаў трансфінпляну, падагульваць эфэкты работы за кожны дзень.

Да рэчы сказаць, сапраўднага ўліку на суднах і прыстанях Днепра-Дзьвінскага басэйну мы на сёньняшні дзень ня маем.

На пасяджэньні прэзыдыуму райкамводу высьветлілася, што ў большасьці суднаў упіковыя кнігі знаходзяцца ў самым агідным становішчы, справаздачнасьці запушчаны, капітаны разраховаў гэтаму пытаньню аддаюць надзвычай мала увагі.

Гаспадарчы разрахунак на водным транспарце трэба ператварыць у канкрэтную зброю штодзеннага апэрацыйнага кіраўніцтва па выкананьні і перавыкананьні трансфінпляну асеньняй навігацыі.

Апартуністычная практыка „Белрыбы" і „Белрыбаксаюзу" тармозяць загатоўкі рыбы

«Белрыба» і «Белрыбаксаюз», як мы ўжо ня раз адзначалі, ня здолелі перабудаваць сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі забесьпячэньня прамысловых цэнтраў рыбай.

«Белрыба» і «Белрыбаксаюз» ня ведаюць, што робіцца на мясцох, на вучастках і ў арцелях. У кіраўніцтве рыбнай справай пануюць бюракратычныя, габінэтныя мэтады работы.

Нічога ня зроблена з боку «Белрыбы» і «Белрыбаксаюзу», каб ахапіць рыбакоў калектывізацыяй, зьдзельшчынай, каб укараніць у арцелях сацыялістычныя мэтады працы.

Белрыбаксаюз «забыўся» свячасова загатовіць тару для рыбных вучасткаў і гэтым сарваў плян загатовак экспартнай рыбы. Сарвана кампанія заключэньня кантрактацыйных дагавораў на загатоўку экспартных ракаў.

Паміж «Белрыбай» і «Белрыбаксаюзам» няма дзелавой увязкі ў рабоце. Рыбныя вучасткі патрабуюць жывой сувязі і сыстэматычнага кіраўніцтва, між тым, інструктары Белрыбаксаюзу вельмі рэдка бываюць на пэрыфэрыі.

З-за дрэннага кіраўніцтва рыбнай справай на важнейшых рыбных вучастках — Аршанскім, Жлобінскім, Мазырскім — пляны ўлову ня выконваюцца з кварталу ў квартал.

Да 1-га жніўня гадавы плян улову выканан менш чым на 40 проц., плян загатовак экспартнай рыбы—на 14-15 проц.

Апартуністычная практыка ў рабоце «Белрыбы» і «Белрыбаксаюзу» тармозіць работу рыбацкай сыстэмы.

Патрэбна рашучае ўздараўленьне кіраўніцтва рыбзагатоўкамі. Плян улову зусім РЭАЛЬНЫ, ён павінен быць АЖЫЦЬЦЁЎЛЕН.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Першая г. ўкавая мастацкая карціна Пуцёўка ў жыцьцё. Драма ў 34 эпізодах
„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — БУЙНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ДЗЯРЖАЎНЫ ЧЫНОЎНІК у гал. ролі—РЯГОЖЫН
Інтэрнацыянал Пач. 1 с. у 7 г. в. — Тры мушкецёры паво дле раману Дзюм ў 12 частках у гал. ролі ДУГЛАС ФЭРБЕНКС.
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. — Апошнія 2 сэрыі, 18 част. у адзін сэанс СТЭНЛЕЙ у нетрах Афрыкі.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — 10 жніўня—адкрыцьцё 1) „Сіні пакунак" у 7 частках. 2) „Па ленінскім шляху" Пачатак у 2 гадз. дня.
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, 11 Каса—з 5 гадз — САЛАМАНДРА Драма ў 7 частках

Галоўмастацтва НКА і Белдрамтаварыства праводзяць МЕСЯЧНІК па стварэньні ЭСТРАДНАГА РЭПЭРТУДУ на тэму „АБАРОНА СССР".
Усе матар'ялы павінны накіроўвацца ў Галоўмастацтва НКА (Менск, Плац Волі) да 1-га верасьня г. г.
Творы, дазволеныя да выкананьня, будуць аплачвацца ў памеры 1 руб. за радок вершу і 300 руб. друк. аркуш прозы і музыка 50 руб. за нумар. Творы рэкамэндаваныя да выкананьня—у памеры 2 руб. за радок вершу і 600 руб. друк. аркуш прозы і музыка 100 руб. за нумар.
Апрача таго за лепшыя творы будуць выданы Белдрамтаварыствам грашовыя преміі.
Творы прынятыя Галоўмастацтвам будуць перададзены для выкананьня ў тэатры, эстрадныя групы, агітпропбрыгады і г. д. без дадатковай аплаты аўтарам.
Галоўмастацтва НКА Шампур.
Белдрамтаварыства Ільлінскі.

СЁНЬНЯ, у 7 гадз. вечара, у клюбе Саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай) арганізуецца ВЕЧАР, прысьвечаны ДЫРЫЖАБЛЯБУДАЎНІТВУ.
Пасьля ўрачыстай частні—ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ.
Уваход па білетах, якія сакратарам пч. АСО неабходна атрымаць у Гарсавеце Асовіяхіму 8 і 9 жніўня з 11 г. да 6 г. веч.
Гарсавет Асовіяхіму.

11 жніўня, у 7 гадз. веч., у садзе Працасьветы
Менскі Гарком МОПР'у скліча АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ АКТЫЎ МОПР'у.
Парадак дня:
1) Аб выніках III пленуму ЦК і II пленуму Менгаркому МОПР'у.
2) Аб кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным.
Пасьля дакладу—канцэрт.
Білеты можна атрымаць у гаркоме МОПР'у (Савецкая, 87) штодзенна ад 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.
У выпадку дрэннага надвор'я нарада перанясіцца ў Дом Працасьветы—Камуністычная, 19.
Менгарком МОПР'у.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт абвяшчае асеньні набор студэнтаў на наступныя факультэты:
1. Фізыка матэматычны (беларуск. і яўр. сэкцыі)
2. Хэмічны (беларуск. сэкцыя)
Заявы прымаюцца да 20 жніўня г. г. у канцылярыі БДУ (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус).
Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Правілы прыёму абвешчаны ў даведчыку НКА.
70 проц. прынятых студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Для сямей студэнтаў БДУ кватэр не прадстаўляе.
Аб тэрміне пачатку заняткаў в новым наборам будзе паведамлена асобна.
ЧВП Рэктара БДУ В. Рудніцкі.

Беларускі Дзяржаўны ВЯЧЭРНІ УНІВЭРСЫТЭТ абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на БІЯЛЁГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі БДУ (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус) штодзенна да 10 верасьня г. г. Правілы прыёму абвешчаны ў даведчыку НКА аб паступленьні ў ВНУ.
Аб тэрміне пачатку заняткаў на Вячэрнім БДУ для нова-прынятых студэнтаў будзе абвешчана асобна.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі студэнты Вячэрняга БДУ не забясьпечваюцца.
ЧВП Рэктара БДУ В. Рудніцкі.

ВСНГ БССР абвяшчае ПРЫЁМ слухачоў-завочнікаў на завочныя курсы гаспадарнікаў пры курсах Чырвоных Дырэктароў у г. Менску.
За ўсімі даведкамі наконт залічэньня зварачацца непасрэдна на курсы па адрасе: Зямляробскі Заў. № 4, памяшканьне Хэміка-Тэхналёгічнага Ін-ту.
Сэктар кадраў ВСНГ БССР.

Віцебскі дзённы рабфак пры Індустрыяльна-пэдагагічным інстытуце абвяшчае, што АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў і ПАДАЧА ЗАЯЎ праводзіцца да 21 жніўня г. г. на 1-шы курс агульнага аддзяленьня—90 асоб, на яўрэйскае аддз.—60 асоб, на 2-гі курс агульнага аддз.—10 асоб і на 3-ці курс яўрэйскага аддз.—5 асоб.
Да іспытаў дапускаюцца рабочыя, батракі, калгасьнікі і беднякі, як па камандыроўках НКА, так і без камандыровак,